Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЖНІЎНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 148 (28006) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Іх аб'яднала вайна

СТАР. 6

Мегаполіс памерам з краіну

СТАР. 9

Шанц вярнуцца дадому

СТАР. 12

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:

«Каб прымаць правільныя кіраўнічыя рашэнні на ўзроўні вобласці, горада, раёна, трэба, безумоўна, ведаць рэальную сітуацыю. Менавіта падчас стасункаў з насельніцтвам у фармаце «прамых ліній», асабістых прыёмаў, выездаў у рэгіёны, сустрэч у працоўных калектывах мы атрымліваем дадатковую інфармацыю і бачым, дзе праблемныя месцы, дзе патрабуецца больш увагі з боку ўлады, куды трэба накіраваць больш сродкаў. Гэта часам дае падставы для карэкціроўкі нашай дзейнасці. У апошні час зносіны з людзьмі сігналізуюць пра новыя праблемы. Не толькі традыцыйныя пытанні ЖКГ хвалююць людзей. Шмат зваротаў паступае па прыватызацыі жылля, па пытаннях працаўладкавання і выплаты зарплаты. На падставе аналізу зваротаў у рэгіёнах прымаюцца пэўныя рашэнні, у тым ліку ўрадам».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 06.08.2015 г.

Долар ЗША	15565,00	▲
Еўра	16926,00	▼
Рас. руб.	248,37	▲
Укр. грыўня	720,60	▲

ISSN 1990 - 763X

ГРАФ І ГРАФІНЯ

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Менавіта так называюць Аляксандра Васільевіча і Веру Яўгенаўну ў сяле Райца Карэліцкага раёна. І не толькі за знешні высакародны выгляд і за тое, што, жывучы разам 30 гадоў, Салдатавы працягваюць называць адно аднаго на «вы» і па бацьку. Іканапісец Аляксандр Васільевіч і майстрыха саломапляцення Вера Яўгенаўна ўзяліся аднаўляць сядзібу калісьці вядомага роду памешчыкаў Раецкіх і ўжо прымаюць гасцей у эколага-музейным комплексе. А гэтыя партрэты сябар сям'і Алесь Квяткоўскі напісаў да юбілею сужэнцаў.

УМАЦАВАЦЬ СТАТУС ПРАФТЭХАДУКАЦЫІ

Яна сёння — стартавая прыступка для будучых кваліфікаваных спецыялістаў

Фота БЕЛТА.

Такую думку выказала намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА. Яна правяла сустрэчу з прадстаўнікамі ўстаноў адукацыі Гомельскай вобласці ў сярэдняй школе №16 Мазыра, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

СТАР. 2

■ На слыху

ІКРА ЧОРНАЯ, ІКРА ЧЫРВОНАЯ

«Белрыба» гатова даказаць высокую якасць сваёй прадукцыі

«А ікра ж несапраўдная!» — заявілі нядаўна ветэрынарныя службы Расіі і вярнулі пастаўшчыку ААТ «Белрыба» больш за 15 тон рыбнага далікатэсу. Беларускае прадпрыемства не пагадзілася з такім паваротам і заявіла пра гатоўнасць да новых лабараторных выпрабаванняў.

ВЫКЛЮЧНА ПА РЭЕСТРЫ

«Пры малекулярна-генетычным аналізе адабранага ў парадку планавага кантролю і назірання ўзору ікры ласасёвай крупчастай (стронга) вытворчасці ААТ «Белрыба», у даследаваным узоры ДНК відаў рыб сямейства ласасёвых не выяўлена, што сведчыць аб штучным паходжанні прадукцыі», — паведаміў Рассельгаснагляд, вяртаючы ікру ў Беларусь.

Такія дзеянні «Белрыба» палічыла незаконнымі і ў адказ падала скаргу ў дэпартамент ветэрынарнага і харчовага нагляду Мінсельгасхарча Беларусі і ва ўпраўленне Рассельгаснагляду па Бранскай і Смаленскай абласцях Расіі.

СТАР. 5

Прамая лінія

А ВАШ ЦІСК — ПАД КАНТРОЛЕМ?

Скача артэрыяльны ціск? Не можаце знізіць узровень халестэрыну? Не ведаеце, колькі часу можна працаваць на дачы з дыягназам «артэрыяльная гіпертэнзія»? Пра ўсе асаблівасці дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі артэрыяльнай гіпертэнзіі, стэнакардыі, ішэмічнай хваробы сэрца, інфаркту міякарда можна будзе запытаць у **загадчыцы інфарктнага аддзялення №2 10-й гарадской клінічнай бальніцы г.Мінска, урача-кардыёлага вышэйшай катэгорыі Наталлі Якаўлеўны ПАЛЯЎКОВАЙ** падчас «прамой лініі», патэлефанаваўшы ў рэдакцыю нашай газеты **СЁННЯ з 14.00 да 15.00** па нумары **(8017) 287 18 71**.

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумары **(8017) 287 18 29**.

УМАЦАВАЦЬ СТАТУС ПРАФТЭХАДУКАЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наталля Качанава адзначыла, што ў нашай краіне сфарміравана даволі моцная сістэма прафтэхадукацыі, якую, на жаль, паставілі на другі план. «Неабходна ўмацоўваць яе статус, таму што гэта яшчэ і стартавая прыступка для тых дзяцей, якія хочуць у далейшым удасканальвацца, вучыцца ў ВНУ. Прайшоўшы такую школу, можна стаць сапраўды высакакласным спецыялістам», — сказала яна. Віцэ-прэм'ер дадала, што праблема заключаецца ў недастатковай інфармаванасці нашых грамадзян аб магчымасцях ССНУ. Для гэтага неабходна паказаць іх знутры. Напрыклад, на іх базе можна арганізаваць выкладанне прадмета — працоўнае навучанне. Такая прапанова сёння паступіла ад выкладчыцкага складу.

«Страху няма ў тым, што дзіця можа пайсці вучыцца ў прафтэхустанову. Захоча яно вучыцца далей, у яго для гэтага ёсць усе магчымасці. Іншае пытанне, што гэтыя навучальныя ўстановы павінны працаваць над тым, каб выпускаць кваліфікаваных спецыялістаў не другога, трэцяга, а больш высокіх разрадаў», — канстатавала яна.

У ходзе сустрэчы ў Мазыры, на якой прысутнічалі прадстаўнікі ўстаноў сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай і вышэйшай адукацыі Гомельшчыны, быў закрануты шырокі спектр тэм. У прыватнасці, актыўна абмяркоўвалася пытанне аб паляпшэнні якасці вучэбных матэрыялаў. У многіх педагогаў ёсць прэтэнзіі да падручнікаў. Адна з іх — складаная мова выкладання матэрыялу. Таксама педагагічная супольнасць выказалася пра неабходнасць вяртання да профільных дзясятых, адзінацатых класаў, што дасць магчымасць звязаць сярэднюю адукацыю з вышэйшай і выключыць навучанне выпадковых людзей у старшых класах, дасць большую магчымасць весці прафарыентацыйную работу па рабочых спецыяльнасцях. Асобную прапанову педагогаў Наталля Качанава ўзяла на заметку для наступнага абмеркавання і разгляду.

Намеснік прэм'ер-міністра прадоўжыць рабочыя візіты ў рэгіёны, каб абагульніць думкі спецыялістаў сферы адукацыі і выкарыстаць іх для ўдасканалення работы сістэмы на дзяржаўным узроўні.

■ Добрая навіна

НАПЕРАДЗЕ СНД

Наша краіна заняла высокую пазіцыю ў рэйтынгу самых крэатыўных дзяржаў свету

Беларусь размясцілася на 37-м радку ў штогадовым рэйтынгу Global Creativity Index-2015, заняўшы самую высокую пазіцыю сярод краін СНД. Усяго ў даследаванні прымалі ўдзел 139 дзяржаў свету, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Расія апынулася на наступным радку — 38-м. Лідарамі рэйтынгу Global Creativity Index-2015 сталі Аўстралія, ЗША і Новая Зеландыя. У першую дзясятку таксама трапілі пяць заходнееўрапейскіх краін — Данія, Фінляндыя, Швецыя, Ісландыя і Нідэрланды.

У рамках даследавання эксперты ацэньваюць краіны свету па трох Т: «Талент», «Тэхналогіі» і «Талерантнасць». На думку спецыялістаў, Беларусь займае даволі высокую пазіцыю ў рэйтынгу ў многім дзякуючы сваім жыхарам — у катэгорыі «Талент» краіна ўвайшла ў першую дзясятку, заняўшы 8-е месца па суседстве са Славеніяй, Швецыяй і Новай Зеландыяй.

У аналітыкаў не было звестак па Беларусі, якія далі б магчымасць падлічыць долю так званага «крэатыўнага класа» ў структуры насельніцтва. У адпаведнай графе стаіць прочырк. У сферы тэхналогій Беларусь уваходзіць у лік 50 найлепшых, займаючы 41-е месца.

■ Парламенцкі дзённік

НАЙЛЕПШЫЯ СТАСУНКІ

Уладзімір Андрэйчанка прапанаваў Лаосу стварыць зону свабоднага гандлю з ЕАЭС

На ўчарашняй сустрэчы старшыні Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Андрэйчанкі і намесніка міністра замежных спраў Лаоса Салымсая Камасіта абмяркоўваўся як бягучы стан адносін паміж дзвюма краінамі, так і перспектывы іх узаемадзеяння на прасторы Еўразійскага эканамічнага саюза.

— У апошні час беларуска-лаоскае супрацоўніцтва і ў палітычнай, і ў парламенцкай, і ў гандлёва-эканамічнай дзейнасці набірае абароты, — заўважыў спікер ніжняй палаты ў пачатку сустрэчы. — Натуральна, трэба аддаць належнае, што гэта ўсё робіцца дзякуючы тым дамоўленасцям, якія былі дасягнуты прэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь і Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу на павелічэнне аб'ёму ўзаемнага гандлю: у 2014 годзе ён склаў 5,7 мільёна долараў, гэта хоць і няшмат, але ў 12 разоў больш, чым ранейшы таваразварот.

— Важна тое, што ў нас пачалі праводзіцца пасяджэнні сумесных камісій, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. — Адно пасяджэнне прайшло ў вашай краіне, другое ў красавіку гэтага года — у Беларусі. Я асабіста прымаў удзел у пасяджэнні гэтай камісіі, таму што па просьбе ўрада Рэспублікі Беларусь з'яўляюся куратарам гандлёва-эканамічных адносін паміж Беларуссю і Лаосам.

— Напрацаваны шэраг праектаў паміж нашымі прадпрыемствамі, міністэрствамі, паміж нашымі рэгіёнамі, — адзначыў кіраўнік ніжняй палаты. — Гэта, натуральна, радуе. Але разам з тым трэба адзначыць, што ўсё-такі ўзровень гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва не адпавядае патэнцыялу дзяржаў. Вельмі нізкі экспарт і імпарт. Зараз удзел Беларусі ў ЕАЭС, які паўнацэнна пачаў працаваць сёлета з 1 студзеня, адкрывае шырокія магчымасці, на нашу думку, і для вашай краіны. Тым больш, што Беларусь старшынствуе ў гэтым годзе ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Многія дзяржавы бачаць, што гэты саюз паспяхова працуе, і разглядаюць пытанне аб стварэнні зоны свабоднага гандлю. У маі бягучага года падпісаны дагавор аб стварэнні зоны свабоднага гандлю паміж В'етнамам і Еўразійскім эканамічным саюзам. Зараз некаторыя краіны, у прыватнасці, Інданезія, Турцыя, Іран, Новая Зеландыя таксама жадаюць стварыць зоны свабоднага гандлю. Тавар, які будзе вырабляны, напрыклад, на тэрыторыі Беларусі, бяспошлінна і без усялякіх тэхнічных бар'ераў будзе пастаўляцца на рынкі іншых дзяржаў Еўразійскага эканамічнага саюза. Таму калі ў вас ёсць зацікаўленасць стварыць зону свабоднага гандлю паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і Лаосам, то, натуральна, можна скарыстацца нашым старшынствам.

Уладзімір Андрэйчанка таксама прапанаваў стварыць у Лаосе Асацыяцыю выпускнікоў беларускіх ВНУ: як вядома, у савецкія гады ў нашай краіне навучалася шмат замежнікаў. Намеснік міністра замежных спраў Лаоса зацікавіўся гэтай ідэяй.

Салымсай Камасіт, у сваю чаргу, падкрэсліў, што Лаос высока ацэньвае адносіны з Беларуссю ва ўсіх сферах.

— Пасля Расіі Беларусь на другім месцы сярод краін былога Савецкага Саюза, з якімі Лаос захаваў найлепшыя стасункі, — заявіў ён.

Намеснік міністра замежных спраў Лаоса таксама паведаміў, што ў хуткім часе нашу краіну наведае дэлегацыя Міністэрства культуры Лаоса, плануецца правядзенне Дзён культуры гэтай краіны ў Беларусі.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■ Жніво-2015

ВАЖКІ КАРАВАЙ

І СЁЛЕТА ЦАЛКАМ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПАТРЭБЫ КРАІНЫ

Жніво ўжо перайшло «экватар» — убрана палова пасяўных плошчаў збожжавых і зернебабовых культур. Усяго намалот склаў больш за 4 млн тон пры сярэдняй ураджайнасці 36,1 ц/га. Паводле слоў міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда ЗАЙЦА, дзякуючы намаганням хлебаробаў будзе забяспечана харчовая бяспека дзяржавы. А цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю ў Беларусі павышаць не плануецца з-за яе дастатковай колькасці.

АБЫДЗЕМСЯ БЕЗ ІМПАРТУ

Як адзначыў Леанід Заяц, валавы збор збожжа сёлета чакаецца ў памеры 8,7 — 8,8 млн тон. Гэта крыху менш за паказчык мінулага года — 9,1 млн тон. Аднак, запэўніў міністр, патрэбы дзяржавы будуць забяспечаны ў поўным аб'ёме. У гэтым можна быць упэўненым яшчэ і таму, што ў сховішчах краіны засталося каля 1,5 млн тон збожжа з мінулага года.

«Мы сфарміруем запас харчовага збожжа на 2016 год. Гэта дасць магчымасць нават паставіць прадукцыю на экспарт, бо ў беларускай жытняй муцэ для выпечкі сёння маюць патрэбу рэгіёны Расійскай Федэрацыі», — адзначыў Леанід Заяц.

Па ацэнцы ведамства, для харчовых патрэб краіны неабходна нарыхтаваць каля 699 тыс. тон пшаніцы, 320 тыс. тон жыта, 45 тыс. тон ячменю, 46,5 тыс. тон аўса, 13 тыс. тон грэчкі і 4 тыс. тон проса. Піваварная галіна таксама будзе цалкам забяспечана сваім ячменем.

«Практычна 92% рапсу ўжо ўбрана, намалочана больш за 300 тыс. тон. Застаецца невялікая колькасць плошчаў, уборка якіх завершыцца ў наступныя 2-3 дні», — адзначыў Леанід Заяц. Таксама для забеспячэння жывёлагадоўлі неабходна 7,2 млн тон збожжа, для сяўбы — 630 тыс. тон.

Цалкам завяршыць уборку збожжавых культур у Беларусі плануецца цягам 10—12 найбліжэйшых дзён.

Акрамя таго, па словах міністра сельскай гаспадаркі і харчавання, сёлета не плануецца імпартаваць збожжа: «Мы падвядзём вынікі ўборкі па якасці пшаніцы, якая, у першую чаргу, ідзе на хлебапякарныя мэты і для вырабу макароны. 28-працэнтная клейкавіна забяспечыць патрэбы макароннай прамысловасці ў поўным аб'ёме».

Леанід Заяц падкрэсліў, што Беларусь сёння ў стане цалкам забяспечыць унутраныя патрэбы не толькі ў хлебе, але і ў іншых прадуктах. Акрамя гэтага, частка прадукцыі будзе рэалізавана на экспарт.

АТРЫМЛІВАЮЦЬ І БОЛЬШ ЗА 100 Ц/ГА

Нягледзячы на даволі складаныя ўмовы надвор'я ў час фарміравання ўраджаю збожжавых і зернебабовых, а таксама зніжэнне ўраджайнасці ў краіне, асобныя гаспадаркі Беларусі сёлета намалочваюць больш за 100 цэнтнераў на круг, што, па словах міністра, з'яўляецца рэкордным паказчыкам. Такі вынік паказаў агракамбінат «Сноў», сярэдняя ўраджайнасць збожжавых у якім вось ужо на 25% плошчаў складае 102 ц/га. Як удакладніў Леанід Заяц, асобныя палі даюць нават па 106-110 ц/га!

«Таксама не саступае сёння па паказчыку ўраджайнасці і ААТ «17 верасня» Нясвіжскага раёна. У Гродзенскай вобласці каля 90 ц/га мае СВК «Прагрэс-Верцялішкі». Многія гаспадаркі маюць ураджайнасць вышэй за 70-80 і 90 ц/га», — дадаў кіраўнік ведамства.

Дабіцца такіх паказчыкаў гаспадаркі змаглі дзякуючы строгаму выкананню тэхналогій. Да таго ж на змену старым гатункам сёння прыходзяць новыя, якія фарміруюць ураджай высокай якасці. Па ацэнцы Леаніда Зайца, на жніве сёлета працуюць больш за 10 тысяч камбайнаў. Каля 90% парка машын забяспечана айчынным вытворцам, прычым тэхніка беларускай вытворчасці па тэхнічных параметрах зусім не саступае імпартнай. Не забываюць і пра новыя тэхналогіі. Сёння на палеткі выходзяць машыны з палепшанымі характарыстыкамі. Да прыкладу, збожжаўборачны камбайн КЗС 1624 пачынае задаваць новы тэмп: яго прапускная здольнасць складае 24 кг/с. Першыя 10 камбайнаў ужо апрабоўваюцца на палях Беларусі.

«Усе, хто працаваў на новых машынах, адзначаюць іх высокую надзейнасць і эксплутацыйныя якасці, — адзначыў Леанід Заяц. — Сёння Прэзідэнтам ужо пастаўлена задача забяспечыць серыйную вытворчасць гэтай машыны налета».

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by



НЯВЫРАШАНЫХ ПРАБЛЕМ НЕ БЫВАЕ

Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць і ў гэтую суботу

Практыка падобных зносін паміж жыхарамі краіны і мясцовымі ўладамі працягваецца ўжо больш за паўгода. Кожную суботу беларусы могуць задаць пытанні і агучыць надзённыя праблемы чыноўнікам па сродках тэлефоннай сувязі. Такі спосаб узаемадзеяння створаны з мэтамі павышэння эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

У гэтую суботу, 8 жніўня, прамыя тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 правядуць:

Брэсцкі аблвыканкам
намеснік старшыні Клец Андрэй Анатольевіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам
першы намеснік старшыні Грабнёў Генадзь Іванавіч (80212204260);

Гомельскі аблвыканкам
старшыня Дворнік Уладзімір Андрэевіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам
кіраўнік спраў Папоў Ігар Андрэевіч (80152735644);

Мінскі аблвыканкам
намеснік старшыні Сірэнка Віктар Іванавіч (80175004160);

Магілёўскі аблвыканкам
намеснік старшыні Малашка Валерый Анатольевіч (80222501869);

Мінскі гарвыканкам
намеснік старшыні Дамарацкі Андрэй Уладзіміравіч (80172224444).

■ Ад'язджаюць цягнікі...

Мінск-Пасажырскі — самы лепшы вакзал

Беларуская чыгунка падвяла вынікі штогадовага рэспубліканскага агляду санітарнага стану і добраўпарадкавання чыгуначных вакзалаў. Пераможцам прызнаны вакзал станцыі Мінск-Пасажырскі — яму прысуджана першая прэмія сярод пазакласных вакзалаў.

На другім месцы ў гэтай жа катэгорыі класнасці — вакзал станцыі Гомель. Сярод вакзалаў першага класа найлепшым прызнаны вакзал станцыі Магілёў, другая прэмія прысуджана вакзалу станцыі Орша-Цэнтральная. Першую прэмію сярод прэтэндэнтаў, якія адносяцца да другога класа, атрымаў вакзал станцыі Пінск, другую — вакзал станцыі Полацк. Сярод вакзалаў трэцяга класа першая прэмія прысуджана вакзалу станцыі Ліда, другая — вакзалу станцыі Крычаў.

Апроч санітарнага стану і праведзенага цягам мінулага года добраўпарадкавання вакзалаў і прылеглых тэрыторый пры падвядзенні вынікаў конкурсу ўлічваліся таксама іх архітэктурная выразнасць, афармленне фасадаў, абсталяванне тэрыторый малымі архітэктурнымі формамі, паляпшэнне якасці абслугоўвання пасажыраў, пашырэнне колькасці і павышэнне якасці ўзроўню паслуг, што прапаноўваюцца.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Да вашых паслуг

АДПРАЎЛЕННЕ ДАСТАВЯЦЬ З КАМФОРТАМ

Той, хто хоць аднойчы адпраўляў пасылку альбо ліст (а тым больш — з дакументамі, віншаваннямі, прызнаннямі, фотаздымкамі...) свае пачуцці, напэўна, помніць? Ну па-першае, хацелася, каб усё адпраўленае ў поўнай захаванасці і як мага хутчэй дайшло да месца прызначэння, каб там (па-другое) яго тут жа атрымалі і, пажадана, адразу ж паведамілі, што ўсё дайшло...

Менавіта гэтыя паслугі і былі прадугледжаны лінейкай «Камфорт», у рамках якой днямі ўведзены дадатковы сэрвіс «Аплачаная дастаўка ў вячэрні час». Гэта значыць, што цяпер з любога кутка краіны можна адпраўляць так званыя зарэгістраваныя паштовыя адпраўленні (лісты, пасылкі), па якія атрымальніку ўжо не давядзецца хадзіць на пошту: пошта (пакуль — толькі сталічная, а потым, пры попыце на паслугу, і ў абласных цэнтрах) даставіць іх сама.

— Мы пастаянна трымаем сувязь з нашымі кліентамі, вывучаем іх запатрабаванні, — гаворыць **намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Таццяна ГВОЗДЗЕВА**. — І таму цудоўна ведаем, што вельмі многім з іх (асабліва людзям занятым, якія працуюць) не заўсёды хапае часу, каб зазірнуць на пошту і забраць, напрыклад, сваю пасылку. Чаму б тады нам за пэўную даплату не дастаўляць яе ў зручнае для кліента месца, у зручны для яго ж вячэрні час — з 19 да 21 гадзіны...

Адпраўленні лінейкі «Камфорт», па словах Таццяны Мікалаеўны, сталі запатрабаванымі амаль адразу ж, бо яны выгадныя і таму, хто адпраўляе карэспандэнцыю (на яго тэлефон тут жа прыходзіць SMS-паведамленне аб уручэнні), і таму, хто атрымлівае (яму даецца магчымасць выбраць не толькі зручны для сябе адрас уручэння, але і час (а цяпер яшчэ і вячэрні)...

Апроч гэтай і сапраўды камфортнай дастаўкі «Белпошта» да канца года і ў самых шматлюдных месцах (на чыгуначным вакзале, ля станцый метрапалітэна ды гіпермаркетаў) плануе ўстанавіць 20 паштамтаў, з дапамогай якіх кліенты самі змогуць атрымліваць адрасаваныя ім паштовыя адпраўленні.

Валянціна ДОЎНАР.
dounar@zviazda.by

■ Факт

У ГРОДНЕ Б'ЮЦЬ СУСВЕТНЫЯ РЭКОРДЫ

Учора ў горадзе над Нёманам стартаваў чэмпіянат свету па пажарна-выратавальным спорце

Ён прадоўжыцца чатыры дні. Гэтае мерапрыемства ўключае ў сябе чатыры сусветныя першынствы: першы чэмпіянат свету сярод нацыянальных мужчынскіх маладзёжных камандаў, другі чэмпіянат свету сярод нацыянальных жаночых маладзёжных камандаў, а таксама шосты чэмпіянат свету сярод юнакоў і юніёраў і другое першынство свету сярод дзяўчат і юніёрак па пажарна-выратавальным спорце.

Фота БЕЛТА.

І ў першы ж дзень спаборніцтваў былі пабіты сусветныя рэкорды.

— Рэкардсменкамі сталі ўдзельніцы другога першынства свету сярод дзяўчат і юніёрак у сярэдняй і старэйшай групе, — расказвае **начальнік прэс-службы МНС Віталь НАВІЦКІ**. Гэтае першынство адкрыла чэмпіянат ў Гродне з практыкавання «Пад'ём па штурмавых лесвіцах у акно другога паверха вучэбнай вежы». У сярэдняй узроставай групе (15-16 гадоў) адразу тройчы быў пабіты папярэдні рэкорд свету, які ўстанавіла беларуска Алена Прышчэпава (7,79 с.). Так, Ганна Старадымава з каманды Расіі паказала вынік 7,31 с. Сама Алена Прышчэпава таксама пабіла свой папярэдні рэкорд, выканаўшы ўздым за 7,52 с. Полька Наталля Гутманьска паднялася на другі паверх вучэбнай вежы за 7,76 с. Чацвёртай стала зямлячка Алены Прышчэпавай з Гомеля — Валерыя Казачэнка.

У старшай групе юніёрак (17-18 гадоў) у фінальных забегах будуць удзельнічаць таксама прадстаўнікі Беларусі, Расіі і Польшчы. Віцябчанка Кацярына Багданава і Аксана Карэва з БДУФК паказалі вынікі, якія перавышаюць папярэдні сусветны рэкорд, — 7,66 с. і 7,64 с адпаведна. З беларускімі спартсменкамі гэтай узроставай групы ў фінале таксама пазмагаюцца Марыя Васільева з Расіі і Марта Ягода з Польшчы.

У малодшай групе (да 14 гадоў) лепшыя вынікі ў забегах паказалі Алсу Бакірава, Віялета Кісялёва і Ірына Дзямідава з расійскай каманды і навапалачанка Кацярына Сямёнава.

СЯБРУЕ КНІГА З ЛЕТАМ!

«Белкніга» і кніжныя выдавецтвы Мінінфарма краіны ладзяць адмысловую акцыю ў мінскай кнігарні «Светач».

Сёння, 6 жніўня, а 13-й гадзіне пакупнікоў, адпаведна — чытачоў (найперш — дзяцей, школьнікаў) у «Светач» на сустрэчу запрашаюць дзіцячыя пісьменнікі. Сваімі расповедамі пра казачныя і сапраўдныя гісторыі, якія яны прыдумалі ці падгледзелі ў жыцці, падзеляцца Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Міхась Пазнякоў, Дзмітрый Пятровіч, Ніна Галіноўская, Таццяна Сівец, Алег Ждан, Віктар Шніп, Віктар Ляскоўскі і іншыя паэты і празаікі. Дарэчы, кнігі і нават сшыткі, школьныя дзённікі, алоўкі, фарбы, ды шмат што з таго, што школьніку можна ў партфель пакласці, кнігарня ў час акцыі прапануе пакупнікам на 10 працэнтаў танней, чым звычайна.

Арганізатарамі сапраўды творчага праекта поруч з «Белкнігай» выступілі выдавецтва «Мастацкая літаратура» і Выдавецкі дом «Звязда». Між іншым, у гэты дзень кнігарня будзе адчынена да 23.00.

Сяргей ШЫЧКО.

■ Новыя медыя

ЗАПОСЦІЦЬ МЕРКАВАННЕ

У Мінску збяруцца «зоркі» благасферы краін СНД.

Беларуская сталіца стане месцам правядзення чацвёртай штогадовай сустрэчы актыўных карыстальнікаў сацыяльных сетак «НеФорум». Днямі ў Маскве прайшла прэс-канферэнцыя, на якой праанансавалі будучае мерапрыемства. Арганізатарам выступае Еўразійскі камунікацыйны цэнтр.

Удзел у «НеФоруме» возьмуць больш як 150 папулярных блогераў з краін СНД. Гэта асобы, вядомыя сярод карыстальнікаў сацыяльных сетак («УКантакте», Youtube, Instagram) і блогерскіх платформаў, у першую чаргу LiveJournal. Акрамя таго, на сустрэчу запрошаны і прафесійныя журналісты.

— Для нас гэта і высокі гонар, і ў той жа час высокая адказнасць, бо мы ўпершыню прымаем такі прадстаўнічы форум, — сказаў **саветнік-пасланнік Пасольства Беларусі ў Расіі Павел ЛЁГКІ**. — Для нас вельмі важна, каб Беларусь убачылі такой, якая яна ёсць, каб напісалі і расказалі сваім падпісчыкам, якая яна. Я вельмі разлічваю, што з дапамогай папулярных, вядомых блогераў мы ўсе адкрыем Беларусь зноўку.

Тэма форуму — «Новыя лідары меркаванняў». З 21 па 23 жніўня ўдзельнікі правядуць серыю майстар-класаў, сустрэнуцца з кіраўніцтвам Мінгарвыканкама, наведаюць Мір, Нясвіж, гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна» і ўбачаць, як працуе офіс кампаніі Wargaming. Дарэчы, шанц трапіць на «НеФорум» у якасці слухача мае кожны ахвотны, для гэтага трэба запоўніць заяўку на сайце ЕКЦ.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Чулі?

ВЫ КУДЫ, САША?

Аляксандр Глеб можа працягнуць кар'еру ў... Індыі

Насычанае футбольнымі навінамі лета працягваецца для айчынных заўзятараў. Учора на сваім полі ў 3-м раўндзе кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў змагаўся барысаўскі БАТЭ, сёння за выхад у наступны раўнд Лігі Еўропы з «Цюрыхам» паспрачаецца мінскае «Дынама».

На фоне гэтых падзей у айчынным футболе разгортваецца яшчэ адна, не менш цікавая, інтрыга: дзе працягне сваю кар'еру Аляксандр Глеб? Indian Super League паведамляе, што беларускім паўабаронцам зацікавіўся індыйскі клуб «Атлетыка дэ Калькута», адным з уладальнікаў якога з'яўляецца мадрыдскі «Атлетыка».

У 2014 годзе каманда стала першым чэмпіёнам Індыйскай суперлігі. Таксама нядаўна ў гэты клуб перайшоў экс-нападаючы зборнай Партугаліі Элдэр Пашціга.

Нагадаем, раней паведамлялася аб тым, што ў паслугах Аляксандра Глеба зацікаўлены і барысаўскі БАТЭ. Аднак сам футбаліст назваў гэтую інфармацыю чуткамі.

— Не хачу нічога каментаваць. Гэта ўсё чуткі, — сказаў ён.

У канцы ліпеня Глеб быў заўважаны і на трэніроўцы мінскага «Дынама», аднак уладальнік клуба Юрый Чыж выключыў магчымасць з'яўлення гэтага футбаліста ў стане бела-блакітных.

— Гэта ж бяда ў камандзе. Хочаш развалiць яе — запрасі Глеба, — з усмешкай адзначыў Юрый Аляксандравіч.

Мінулы сезон Аляксандр правёў у турэцкай суперлізе, па ходзе чэмпіянату перайшоўшы з «Коньяспара» ў «Генчлербірлігі». Футбаліст згуляў 34 матчы, у якіх забіў два мячы і зрабіў пяць выніковых перадач. Раней Глеб выступаў за такія клубы, як «Штутгарт» (Германія), «Арсенал» (Англія), «Барселона» (Іспанія), «Вольфсбург» (Германія), «Бірмінгем Сіці» (Англія), «Крылы Саветаў» (Расія).

Адзначым, што ён стаў першым беларускім футбалістам, які згуляў у фінале Лігі чэмпіёнаў УЕФА (у 2006 годзе з «Арсеналам»), а таксама першым беларусам, які выйграў Лігу чэмпіёнаў (у 2009 годзе з «Барселонай»).

З'яўляецца чэмпіёнам Беларусі (у 1999 і 2012 гадах з БАТЭ), віцэ-чэмпіёнам Германіі (са «Штутгартам» у 2003 годзе) і чэмпіёнам Іспаніі (з «Барселонай» у 2009 годзе).

Аляксандр Глеб шэсць разоў прызнаваўся найлепшым футбалістам Беларусі: у 2002, 2003, 2005, 2006, 2007 і 2008 гадах.

У 2005 годзе ўвайшоў у сімвалічную зборную Бундэслігі.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

КРУГАВЫ РУХ НА ПЛОШЧЫ — ПА-НОВАМУ

На ўчастку каля сталічнай плошчы Перамогі адбыліся змены ў арганізацыі дарожнага руху.

Як паведамілі ва УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, каб выключыць шматлікія выпадкі перастраення транспартных сродкаў і знізіць колькасць аварыйных сітуацый, было прынята рашэнне аб яго змяненні на ўчастку, дзе арганізаваны кругавы рух. Яны датычацца крайняй левай паласы. Цяпер няма неабходнасці рабіць манеўр перастраення ў суседнюю паласу дзеля таго, каб прадоўжыць свой рух прама, у выпадках, калі транспартныя сродкі рухаюцца з боку вуліцы Казлова ў кірунку вуліцы Янкі Купалы па крайняй левай паласе.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Разважанні пра сучаснасць

«ГІСТОРЫЯ ІСНУЕ НЕ ТОЛЬКІ Ў РЫМЕ»

Чаму Мсціслаў павінен стаць запаведнікам, дзе праходзіла мяжа Кіеўскай Русі, і ў чым Буглак мерыўся з Радзівіламі

Ігар Марзалюк лічыць сябе беларусам да кончыкаў пазногцяў. І беларуская мова, якой ён карыстаецца нават у побыце, не нейкая там даніна модзе, а яго асабістая пазіцыя. Лёгка лічыць сябе патрыётам на словах, трэба быць ім у жыцці. І ў стаўленні да сваёй працы, і да тых, хто жыве побач, і ўласна да слова. На роднай мове яно часам гучыць больш шчыра і пераканаўча. Доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Куляшова, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, ён шмат чаго зрабіў для таго, каб мы сталі лепш ведаць сваю гісторыю. А галоўнае, зразумелі, што і нам ёсць чым ганарыцца. Пра гэта і іншае наша гаворка з Ігарам Марзалюком.

— На нядаўнім Рыцарскім фэсце ў Мсціславе, калі вы казалі пра былую веліч горада, пра яго ўраджэнцаў, адчувалася, што вам гэта баліць.

— Я люблю Беларусь. Для мяне гэта не проста месца прапіскі, пражывання, працы. Любіць — значыць рабіць нешта пазітыўнае на карысць, а не крычаць, што ніхто нічога не робіць. Я вельмі ўсцешаны тым, што ў Мсціслаўскім райвыканкаме так ставяцца да сваёй гісторыка-культурнай спадчыны. Калі б так адносіліся ўсе, гэта было б фантастычна. Не буду ўзгадваць раёны, але, здараецца, сам выходзіш з ініцыятывай, прапаноўваеш нейкія там археалагічныя маршруты, накідваеш цэлую праграму, а ў адказ — мёртвая цішыня.

— Мсціслаў стаў месцам апошніх сенсацыйных знаходак, якія, па вашых словах, даюць яму права прэтэндаваць на званне горада-музея. Наколькі гэта рэальна здзейсніць?

— Мсціслаў — адзіны горад, які можа без усялякіх там нацяжак прэтэндаваць на такі статус, прычым на статус нацыянальнага запаведніка. Мы пачалі музеефікацыю Замкавай гары, не чакаючы нікога. Будзем рабіць усё магчымае і немагчымае ў рамках любых свят, любых бюджэтаў фінансавання, нейкіх новых рэспубліканскіх праграм. У Магілёўскай вобласці няма ніводнага запаведніка. Мсціслаў заслугоўвае права па ўсіх параметрах. Будзем пераконваць кіраўніцтва краіны, паказваць унікальнасць горада. І справа не толькі ў археалогіі. Ну, дзе яшчэ ёсць яблыкасховішча XIX стагоддзя, зробленае па апошнім «піску» тэхналогій? Тут ёсць унікальныя калекцыі прыватных рэчаў, дакументаў, пабудовы розных эпох. Гэта мікрамадэль Беларусі. Можна паказаць любую эпоху, любы перыяд, пачынаючы ад палеаліту. Наколькі магчыма, я агучваю гэтую тэму, лабіруючы яе і ўвожу ў вушы ўсім — і міністру культуры, і віцэ-прэм'еру. Чаму мне ў Мсціславе так добра працуецца? Таму што не трэба абрываць тэлефон і ў кагосьці нешта выпрошваць. Калі ўлада зацікаўлена, усё атрымліваецца хутка. І вельмі важна, што ў такой складанай эканамічнай сітуацыі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір Даманеўскі і старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Васіль Віцюноў робяць усё для таго, каб выратаваць гэты помнік.

Лічылася, што культурны слой на Замкавай гары Мсціслава складае толькі тры метры, што там няма матэрыялаў, ранейшых за XII стагоддзе. Падчас нашых даследаванняў аказалася, што яшчэ дагарадскі этап у гісторыі Мсціслава пачаўся ў V стагоддзі, знойдзена кераміка трэцяй чвэрці V—VII стагоддзяў. Калі летась я адкрываў маставую, быў упэўнены, што яна ў лепшым выпадку датуецца сярэдзінай XII стагоддзя. Аказалася, што там ляжаць дошкі, якія былі ссечаны не раней 1098 года. І самае галоўнае, што маставая знаходзіцца на магутным культурным слоі, больш чым 4 метры. Сёлета мы пашырылі раскоп з 44 квадратных метраў да 122, каб зрабіць музеефікацыю аб'екта. У выніку нам пашэнціла належным чынам даследаваць мсціслаўскі вал. Ён складзены з гліны і драўлянай каркаснай канструкцыі. Унутры яе ляжала вялікае дубовае палена, на якім нават захавалася кара. На сёння ўстаноўлена, што Мсціслаў як умацаваны горад стаў развівацца не пазней за сярэдзіну XI стагоддзя. Гэта значыць, што ён быў заснаваны не ў 1135 годзе, як лічылася дагэтуль, а ў 1052-1053 гадах. Мы перадалі ў Мінск для даследаванняў культурны слой XII-XIII стагоддзяў з мсціслаўскім смеццем. Хутка будзем ведаць, што расло на Замкавай гары, чым харчаваліся жыхары. Мы нічога не выкідвалі, усё перабіралі пальчыкамі, 600 кубоў зямлі выйшлі на гэтую паверхню, дзякуючы маім студэнтам, якія працавалі, калі трэба было, і па 16 гадзін.

Мсціслаў — унікальны горад. Тут намі знойдзены рыцарскія даспехі. Шлем, які мы паднялі са дна ракі, адзіны ва ўсім свеце такой канструкцыі. Мы другімі ў Беларусі зрабілі з нашага раскопу аб'ект для музеефікацыі. Хачу падзякаваць Лявону Калядзінскаму, які прыдумаў дастаткова танны і эфектыўны метад кансервацыі.

— Што будзе ўяўляць з сябе гэты музей пад адкрытым небам?

— Плануецца на Замкавай гары зрабіць рэканструкцыю будынкаў, якімі яны былі ў XIII ці XIV стагоддзях. Над нашым раскопам будзе зроблена стылізаваная драўляная пабудова, кшталту княжацкага палаца. Побач з'явіцца будынкі з вежай данжон, брама мсціслаўскага замка, фрагменты сцяны. А яшчэ з улікам свята «Рыцарскі фэст» зробім майстэрні ювеліраў, ганчароў, пабудуем рысталішча для бою на конях, «бугурт» для пешых паядынкаў і поле для стральбы з лука па сярэднявечных правілах. Трэба таксама аднаўляць помнікі архітэктуры, мсціслаўскія цэрквы і касцёлы — гэта каласальныя грошы, праца не на адзін год. Але мы павінны яе хай па сантыметры, але рабіць. Кропля камень точыць. Зараз будзем працаваць у Кармеліцкім касцёле, плануем сёлета зрабіць там стацыянарную экспазіцыю.

— Якія яшчэ знаходкі і адкрыцці апошняга часу лічыце найбольш значнымі?

— Магу сказаць, што для мяне вялізарным шчасцем было адкрыццё культурнага слою XII-XIII стагоддзяў на замчышчы ў Магілёве, высвятленне той акалічнасці, у якую практычна ніхто не верыў. На тэрыторыі сённяшняга парку Горкага ў X стагоддзі існавала спачатку неўмацаванае паселішча, а потым, прынамсі не раней за XI стагоддзе, умацаванае, якое было спалена ў сярэдзіне XIII стагоддзя мангола-татарамі.

Надзвычай важнай для мяне была і праца ў Быхаўскім замку, якая пакуль не скончана. Там таксама зроблены ўражваючыя адкрыцці, знаходкі, якія дазваляюць карэктаваць час узвядзення палацавага комплексу, мы знайшлі ўнікальныя кафліны з гербам сына Льва Іванавіча Сапегі — Яна Сапегі.

Безумоўна, я ганаруся сваімі даследаваннямі старога Шклова. Пра тое, што ён існаваў як гарадзішча ў V-VII стагоддзях, што жыццё там віравала з X стагоддзя, пісалі мае папярэднікі Георгій Штыхаў, Вольга Ляўко, але зараз мы можам выразна ўявіць сабе панарамную карціну гэтага горада, сказаць, як выглядалі яго ўмацаванні. Мы сабралі значную калекцыю кафлі, ювелірных вырабаў. Усё паказвае на тое, што ў раннім Сярэднявеччы Шклоў адыгрываў выключна важную ролю як цэнтр акругі, вакол яго было шмат паселішчаў. Ён быў феадальным і сакральным цэнтрам аднаго з малых крывіцкіх плямёнаў.

— Вы неяк казалі, што будзе зроблена цікавая праграма па Слаўгарадскім раёне. Там таксама летась зроблены выключныя знаходкі.

— Слаўгарад, або па-старадаўняму Прапошаск, — апошні горад Чарнігаўскай зямлі. Гэта мяжа Кіеўскай Русі ў канцы X — пачатку XI стагоддзяў. Мы знайшлі там камяні з княжацкімі знакамі. Наогул, слаўгарадская зямля — гэта вялікая колькасць унікальных камянёў з хрысціянскай, язычніцкай сімволікай. Там можна зрабіць музей камянёў. У раёне ёсць цікавыя могільнікі, свяцілішчы. Слаўгарадскі раён — гэта яшчэ і месца, дзе ёсць вельмі цікавая Блакітная крыніца з арыгінальнай легендай. Пра ваду ў беларускай традыцыі я наогул мог бы чытаць лекцыі. У розную крынічку па-рознаму заходзяць, па-рознаму да яе звяртаюцца ў залежнасці ад таго, якой яна лічыцца — мужчынскай ці жаночай. У Слаўгарадзе — гэта Кацярыніна крыніца, прыходзіш да яе на самым досвітку, калі толькі сонца

«Трэба займацца папулярызацыяй ведаў, стварыць адчуванне тысячагадовай гісторыі нашай маладой беларускай нацыі. Каб кожны малады чалавек ведаў, што гісторыя не толькі недзе там, у Рыме, Берліне ці Венецыі, але і ў Беларусі. Што яго радзіма не з'яўляецца нейкім там заняпалым хутарам, што і ў яе хапае традыцый».

ўзыходзіць і яшчэ нікога няма, ходзіш па вадзе і ўголас просіш.

У Краснапольскім раёне ёсць крыніца ў вёсцы Горы, дзе, як сведчаць жыхары, сама Багародзіца з'яўляецца. Там зусім іншы звычай прасіць. Наогул, у нас шмат крыніц, дзе арганічна перапляліся і старажытныя вераванні, і хрысціянскія. У Радомлі ёсць дуб, які расце на малым гарадзішчы. Я застаў яшчэ жанчыну, якая расказвала, што там з'яўлялася Мара — багіня смерці. Яна бачыла яе двойчы ў сваім жыцці — 22 чэрвеня 1941 года і ў дзень, калі грымнуў Чарнобыль. Можна па-рознаму ставіцца да гэтага, але ёсць такія рэчы. Маюцца паведамленні радомльскіх жыхароў, што, калі хацелі знесці іх гарадзішчы, быццам бы прывіды сталі вакол іх і палала вогнішча. Усім стала страшна, і людзі адступіліся. Гэта легенды, паданні, якія таксама трэба збіраць.

— Калі б трэба было назваць тры самыя выбітныя месцы Магілёўшчыны, якія вы выбралі б?

— У кароне Магілёўскай вобласці і наогул Беларусі на ўсходзе ёсць тры важнейшыя дыяменты. Першай велічыні — Мсціслаўскі раён, прычым цалкам, з яго ўнікальнымі манастырскімі комплексамі, помнікамі археалогіі, архітэктуры. Два другія знакавыя месцы — Быхаў (яго замак і сінагога) і Жылічы ў Кіраўскім раёне, дзе знаходзіцца палацавы комплекс Буглакаў. Буглак пастаянна мерыўся з Радзівіламі, імкнуўся іх перасягнуць. У Жылічах знаходзіцца ўнікальны помнік у стылі класіцызму. Яго фрэскавыя роспісы, ляпніна, вінтавыя лесвіцы, дзверы — усё гэта на 90% аўтэнтыка.

— За апошні час вамі сабрана шмат унікальнай інфармацыі, якая можа цалкам перавярнуць уяўленне аб старажытным перыядзе на тэрыторыі сучаснай Магілёўшчыны. Гэта знаходзіць адлюстраванне ў кнігах ці манаграфіях?

— Спачатку планую напісаць нармальны падручнік па гісторыі Беларусі, а потым узяцца за папулярную серыю кніг па гісторыі Беларусі.

Разам з літоўскімі і ўкраінскімі калегамі напісаў калектыўную манаграфію, прысвечаную Грунвальдскай бітве: яна выйшла на ўкраінскай і літоўскай мовах. З'яўляюся аўтарам калектыўнай манаграфіі, прысвечанай гісторыі ўзнікнення ўкраінскага казацтва. Я ўзгадваў там пра беларускія элементы ўкраінскіх казакаў. Ганаруся, што з'яўляюся сааўтарам інтэрнацыянальнай калектыўнай манаграфіі «Рэспубліка Беларусь. Асэнсаванне Незалежнасці», якая зараз рыхтуецца ў Нью-Ёрку і пабачыць свет у найбліжэйшы час.

Трэба займацца папулярызацыяй ведаў, стварыць адчуванне тысячагадовай гісторыі нашай маладой беларускай нацыі. Каб кожны малады чалавек ведаў, што гісторыя не толькі недзе там, у Рыме, Берліне ці Венецыі, але і ў Беларусі. Што яго радзіма не з'яўляецца нейкім там заняпалым хутарам, што і ў яе хапае традыцый.

— Што ў вас, як у гісторыка, выклікае найбольшую прыкрасць? І ці шмат у вас аднадумцаў?

— Мой даўні боль — чорнае капальніцтва, спадзяюся, што да канца года выйдзе ўказ Прэзідэнта, які вельмі істотна паўплывае на сітуацыю. Там прадугледжваюцца жорсткія пакаранні.

А што датычыцца аднадумцаў, то тут я шчаслівы чалавек. У мяне быў дзівосны курс, 5 чалавек паступіла ў аспірантуру. Мой вучань — Аляксей Аўласовіч — займаецца старажытнымі курганамі, Надзея Шуткова — архітэктурна-будаўнічай керамікай. Усе дыпломныя магістарскія работы, якія робяцца пад маім кіраўніцтвам, — гэта не перадраная кампіляцыя, гэта якраз мазольная праца спачатку студэнта, а потым маладога даследчыка на тым ці іншым аб'екце.

Вельмі ўдзячны кіраўніцтву Магілёўскага інстытута МУС, таму што яго курсанты бяруць самы актыўны ўдзел у нашых палявых даследаваннях. Хачу сказаць вялікі дзякуй старшаму памочніку пракурора Магілёва Пятру Палянскаму, які шмат чаго робіць на карысць гісторыі. І штрафы выпісвае тым, хто псуе фасады магілёўскіх помнікаў гісторыі. У многіх няма разумення, што гэта славутасць. Бо, калі бачыш сайдынг ці еўравокны ў будынках XIX стагоддзя, закладзеныя аркі, сэрца крывёю абліваецца. Людзі, якія лезуць у гістарычны цэнтр горада, павінны ведаць, што існуюць ахоўныя зоны. Нельга зарабляць грошы на гісторыі. Пакіньце яе нашчадкам.

Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Ігара МАРЗАЛЮКА.

zigulya@zviazda.by

Ігар МАРЗАЛЮК са сваім былым вучнем, асістэнтам кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін МДУ імя Куляшова Аляксеем АЎЛАСОВІЧАМ.

■ З першых вуснаў

НАДЗВЫЧАЙНАЕ ФІНАНСАВАННЕ НАМ НЕ ТРЭБА

Па словах старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Паўла КАЛАУРА, зараз эканоміка краіны адаптуецца да новых рэалій. Пры гэтым неабходнай умовай і безумоўным прыярытэтам эканамічнай палітыкі становіцца макраэканамічная стабільнасць, якая дасягаецца галоўным чынам праз забеспячэнне стабільнасці нацыянальнай валюты. Акрамя таго, ён спрагназаваў баланс золатавалютнага рэзерву да канца года, а таксама звярнуў увагу на тое, якія крэдыты Беларусь чакае ў найбліжэйшы час.

Фота БЕЛТА.

ЗАЛАТЫ РЭЗЕРВ МЕНШЫМ НЕ СТАНЕ

Нацбанк прагназуе захаванне золатавалютных рэзерваў краіны да канца года на сённяшнім узроўні. Такое меркаванне таксама выказаў старшыня Праўлення Нацыянальнага банка Павел Калаур.

Кіраўнік Нацбанка адзначыў, што ў ліпені былі забяспечаны пікавыя выплаты па абслугоўванні знешняй і ўнутранай валютнай запазычанасці ў памеры 1,3 млрд долараў. Па звестках рэгулятара, за студзень–ліпень 2015 года золатавалютныя рэзервы Беларусі зменшыліся на 0,4 млрд долараў і на 1 жніўня склалі 4,7 млрд.

АДКУЛЬ ЧАКАЦЬ КРЭДЫТАЎ?

Па словах кіраўніка Нацбанка, канчатковая сума крэдыту Еўразійскага фонду стабілізацыі і развіцця (ЕФСР) для Беларусі будзе залежаць ад магчымасцяў фонду.

«Заяўка была першапачаткова на 3 млрд долараў, але канкрэтныя лічбы залежаць ад шэрагу фактараў», — сказаў Павел Калаур.

«Што датычыцца ўзаемадзеяння з экспертамі ЕФСР, — адзначыў Павел Калаур, — то па грашовых агрэгатах, па манетарнай і валютнай палітыцы ў бакоў супярэчнасцяў няма».

«Пэўныя пытанні застаюцца ў частцы структурных рэформаў, але гэта пытанні перамоўнага працэсу», — канстатаваў ён.

Нагадаем, што ў першай палове 2015 года Беларусь падала заяўку на крэдыт у памеры 3 млрд долараў у Антыкрызісны фонд ЕўрАзЭС, які ціпер перайменаваны ў Еўразійскі фонд стабілізацыі і развіцця. У пачатку ліпеня Еўразійскі банк развіцця праінфармаваў, што ЕФСР рыхтуе заключэнне па заяве Беларусі на атрыманне крэдыту.

Таксама Павел Калаур адзначыў, што краіна разлічвае на крэдытаванне Міжнароднага валютнага фонду для вырашэння праблем з плацежным балансам.

«Гаворка ідзе аб механізме пашыранага крэдытавання, які створаны Міжнародным валютным фондам для вырашэння доўгатэрміновых праблем з плацежным балансам і які прадугледжвае адпаведныя макраэканамічныя змены, накіраваныя на тое, каб плацежны баланс краіны насіў устойлівы характар», — удакладніў кіраўнік Нацбанка.

Лічыцца, што прымальная сума магчымага крэдыту ад МВФ будзе ў дыяпазоне 2-3 млрд долараў.

«Сума ў 3 млрд долараў — максімальная лічба. Менавіта яна прадугледжвае надзвычайнае фінансаванне. Я лічу, што было б правільна наладжваць адносіны з Міжнародным валютным фондам, не звяртаючыся да надзвычайнага фінансавання. Такім чынам, лічбы, якія могуць разглядацца, менш за 3 млрд долараў, але больш чым 2 млрд», — выказаў сваё меркаванне кіраўнік Нацбанка.

Паводле яго слоў, беларускі бок настроены на доўгатэрміновае супрацоўніцтва з Міжнародным валютным фондам і ўвогуле задаволены вынікамі апошняга візіту місіі МВФ у Беларусь.

«Безумоўна, каб рухацца далей, мы павінны вызначыцца ў краіне з праграмнымі дакументамі на наступны год. Пасля правядзення кансультацый у рамках гадавых мерапрыемстваў і ўзгадненння падыходаў на наступную пяцігодку мы будзем гатовы да далейшай размовы з МВФ», — адзначыў Павел Калаур.

АРЫЕНТУЕМСЯ НА КУРСАВЫЯ ПРАГНОЗЫ РАСІЙСКАГА РУБЛЯ

Акрамя таго, старшыня праўлення Нацбанка адзначыў, што для значных ваганняў курса валют прычын няма.

«Мы маем збалансаванасць на валютным рынку. Ёсць пэўныя тэндэнцыі, якія прагназаваліся з пункту гледжання насельніцтва, але няма якіх-небудзь фактараў, якія ўздзейнічалі б на курс беларускага рубля і істотным чынам змянялі яго дынаміку», — сказаў кіраўнік Нацбанка.

Ён звярнуў увагу, што рэгулятар арыентуецца на прагнозы экспертаў па курсе расійскага рубля, пры гэтым яго ацэнкі супадаюць з ацэнкамі расійскіх калег. Мяркуецца, што ў найбліжэйшы час ваганні расійскага рубля будуць у межах 55-65 рублёў за долар.

«Такія лічбы ўтрымліваліся ў сцэнарыі ўрада і Нацбанка, — адзначыў Павел Калаур. — Гэта значыць, нічога нечаканага на нашым рынку і нашых суседзяў, што магло б справакаваць рэзкае адхіленне курса валют, не адбываецца».

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
kryzhevich@zviazda.by

ІКРА ЧОРНАЯ, ІКРА ЧЫРВОНАЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«З мэтай абвяржэння інфармацыі, якая з'явілася ў інтэрнэце, ААТ «Белрыба» гатова правесці міжлабараторныя параўнальныя выпрабаванні сыравіны і гатовай прадукцыі (ікры ласасёвай крупчастай) на наяўнасць ДНК ласасёвых парод рыб пры наяўнасці афіцыйнай інфармацыі, якая пацвярджае факты фальсіфікацыі ў акрэдытаванай лабараторыі Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь», — гаворыцца ў афіцыйнай заяве ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама, які з'яўляецца акцыянерам прадпрыемства.

«Калі б факт фальсіфікацыі ікры сапраўды меў месца, вытворчасць ужо закрылі б».

Займацца ікорным бізнесам «Белрыба» пачала ў лістападзе мінулага года. За гэты час прадпрыемства зрабіла 34 пастаўкі ікры ў Расію. Ніякіх прэтэнзій у Рассельгаснагляду да беларускай прадукцыі дагэтуль не ўзнікала. Ды і якія могуць быць прэтэнзіі, калі сыравіну «Белрыба» закупляе ў Еўропе і партнёраў выбірае з рэестра выключна атэставаных Рассельгаснаглядам. Аднак за апошні час ветэрынарныя службы суседняй краіны адпраўлялі назад беларускую прадукцыю ўжо двойчы.

— Тэхналагічны цыкл перапрацоўкі ікры ў нас поўны, доступ пабочных інгрэдыентаў выключаны, вытворчасць сінтэтычнай ікры на базе нашага прадпрыемства таксама не вядзецца, — здзіўляецца рэакцыі расійскіх партнёраў **генеральны дырэктар «Белрыбы» Максім ЦЫГАНКОЎ.**

У цэхах паўсюль вядзецца відэаназіранне, на ўваходах на ўчастку стаяць кодавыя замкі. Пры паступленні сыравіны на прадпрыемства вытворчая лабараторыя робіць уваходны кантроль. Калі ўсе дакументы ў парадку, адбіраюць пробы, якія адпраўляюць у незалежную акрэдытаваную лабараторыю. Там сыравіну правяраюць на адпаведнасць адзіным санітарным патрабаванням. І толькі пасля станоўчага заключэння лабараторыі ікру адпраўляюць у тэхналагічны працэс, дзе кантроль ажыццяўляе служба галоўнага тэхнолага. Гатовая прадукцыя таксама праходзіць выпрабаванні на прадпрыемстве і ў незалежнай акрэдытаванай лабараторыі. На кожную партыю гатовай прадукцыі выдаецца пасведчанне аб якасці.

ШТО ПАКАЖА ТЭСТ НА ДНК?

Журналісты змаглі паназіраць за этапамі вытворчасці ласасёвай ікры на прадпрыемстве. Спачатку нам даводзяць тэхніку бяспекі, пасля прымушаюць надзець аднаразовыя шапачкі, халаты, бахілы і маскі.

Ікра фарэлі паступае ў Беларусь з Даніі ў кардонных каробках вагой 22,5 кг. Уся сыравіна захоўваецца на складзе пры тэмпературы -18 градусаў. Дэфрастацыя (размарожванне) сыравіны адбываецца раніцай на спецыяльнай устаноўцы пры пэўных тэмпературна-вільготнасных рэжымах. Прыкладна праз шэсць гадзін размарожаная ікра ўпакоўваецца ў спецыяльныя латкі, у якіх яе прамываюць каля 5 хвілін. Пасля гэтага ястыкі (ікра ў тонкай шчыльнай плёнцы. — **Аўт.**) адпраўляюцца на сцяканне ў перфараваны латок, а затым — на пасол і выдаленне бялковай ястычнай абалонкі. Для гэтага ікру двойчы праварваюць пры пэўнай тэмпературы ў падсоленай вадзе, пакуль абалонка не раскрыецца. Менавіта на гэтым этапе дэлікатэс набывае салёны смак. Яшчэ раз сцёкшы, ікра адпраўляецца на «грукатанне» — работнікі ў прымым сэнсе грукочуць рукамі па спецыяльным сіце, на якое высыпана ікра, каб выдаліць рэшткі бялковай абалонкі. Ачышчаная ікра праходзіць далейшую інспекцыю, дзе некалькі чалавек (каб не замыльвалася вока) па чарзе ўручную выдаляюць абалонку, якая магла застацца, і лопнутыя ікрынкі. Далей прадукт ідзе ў зону кансервацыі: ён нідзе не стэрылізуецца, таму ў яго неабходна ўнесці кансервант. Нарэшце гатовую ікру дадаткова інспектуюць, пакуюць, узважваюць, закрываюць і накіроўваюць на захаванне.

Уся вытворчасць ікры падзелена на блокі памерам па 7,5 кг сыравіны. Ад пачатку да канца працэс перапрацоўкі займае паўгадзіны. У дзень тут апрацоўваюць да трох тон сыравіны.

— З партыі, па якой узніклі пытанні ў Рассельгаснагляду, мы зрабілі адбор і сыравіны, і гатовай прадукцыі, а таксама НДІ цыталогіі і генэтыкі праводзіць тэст на ДНК. Я ўпэўнены на 100%, што яго вынікі абвергнуць інфармацыю аб «несапраўднасці» ікры, — расказвае гендырэктар. І дадае. — Калі б факт фальсіфікацыі ікры сапраўды меў месца, вытворчасць ужо закрылі б.

Размарожаныя ястыкі рыхтуюць да прамыўкі.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Кожны латок узважваюць перад упакоўкай.

Аналіз, які дасць дакладныя звесткі аб змесце прадукцыі, зойме каля 20 дзён. За гэты час кіраўніцтва прадпрыемства спадзяецца дачакацца афіцыйнага адказу на дасланыя ім скаргі. А 15-тонная партыя чырвонай ікры пакуль ляжыць на складзе: беларускі бок мяркуе, што ў хуткім часе інцыдэнт будзе вычарпаны і пастаўкі адновяцца.

Апроч якасці прадукту, расійскі бок выставіў прэтэнзіі да маркіроўкі.

— У нас ёсць тэхнічны рэгламент Мытнага саюза па маркіроўцы прадукцыі. Паводле яго мы можам наносіць інфармацыю не толькі на ўпакоўку, але і пры дапамозе этыкеткі-стыкера, які складана выдаліць, — тлумачыць **памочнік гендырэктара па вытворчасці Вольга МУРАШКА.**

«Белрыба» ўваходзіць у тройку найбуйнейшых вытворцаў рыбнай прадукцыі ў Беларусі. Па выніках I квартала выручка кампаніі склала 128 800 000 000 рублёў (8,6 мільёна долараў ЗША па бягучым курсе). Асноўная частка прадукцыі прадпрыемства ідзе на экспарт.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
seradzyuk@zviazda.by

■ Да ведама

ЛЯСЫ ЗНОЎ «ЗАКРЫВАЮЦЦА»

На сёння забарона на наведванне лясоў у сувязі з гарачым і сухім надвор'ем дзейнічае ў наступных раёнах:

Брэсцкая, Гомельская і Гродзенская вобласці — усе раёны закрыты;

Мінская вобласць — Бярэзінскі, Вілейскі, Валожынскі, Дзяржынскі, Клецкі, Капыльскі, Любанскі, Мінскі, Смалявіцкі, Салігорскі, Старадарожскі, Чэрвеньскі;

Магілёўская вобласць — Асіповіцкі, Чавускі, Чэрыкаўскі;

Віцебская вобласць — Бешанковіцкі, Гарадоцкі, Дубровенскі, Лепельскі, Лёзненскі, Сенненскі.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

ПАЛЯВАННЕ ПЕРАНОСІЦЦА

Пачатак сезона паляванння на вадаплаўную і балотную дзічыну ў Беларусі пераносіцца з 8 на 22 жніўня.

Гэта прадугледжана распараджэннем прэм'ер-міністра №266р ад 5 жніўня 2015 года, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.

Паляваць дазваляецца ў светлы час сутак ружэйным спосабам з засады, з падыходу, з пад'езду на маламерных суднах. Паляўнічыя могуць выкарыстоўваць пры гэтым гладкаствольную паляўнічую зброю і патроны са шротам, а таксама паляўнічых сабак (усе групы, акрамя ганчакоў і хартоў). Што датычыцца маламерных суднаў, якія таксама дазволены для гэтага віду паляванння, то яны павінны быць без рухавіка або з непрацуючым рухавіком.

ІХ АБ'ЯДНАЛА ВАЙНА

Наша паштовая скрыня працягвае папаўняцца. У лістах, якія прыходзяць у рэдакцыю з усіх куточкаў Беларусі, успамінамі дзеляцца ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, распавядаюць пра гісторыю сваёй сям'і іх дзеці, унукі і праўнукі, пра адважных землякоў пішуць аднавяскоўцы. У кожнай мясцовасці былі і ёсць свае героі, якіх шануюць і памятаюць.

Інвалід Вялікай Айчыннай вайны Іван АСТАПУК.

Зямляк

Нядаўна свой 90-гадовы юбілей адзначыў інвалід Вялікай Айчыннай вайны Іван Астапук, які жыве ў вёсцы Высокае, што ў Маларыцкім раёне. Маладым 19-гадовым хлопцам у студзені 1944 года ў складзе партызанскага атрада імя Літвінава брыгады імя Флегантава Брэсцкага партызанскага злучэння пачаў ваяваць з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Прымаў удзел у розных баявых аперацыях партызан, асабіста падрываў рэйкі на чыгунцы Брэст — Маларыта.

Вось што піша пра свайго калегу настаўнік Лукаўскай сярэдняй школы Мікалай Баліцэвіч: *«З набліжэннем фронту партызаны злучыліся з вайсковымі часцямі Чырвонай Арміі на ўкраінскай тэрыторыі. Іван Аляксандравіч быў мабілізаваны ў армію. Спачатку праходзіў службу ў 222-м запасным палку, а затым быў накіраваны ў дзеючую армію (93-і стралковы полк 160-й дывізіі 70-й арміі 1-га Беларускага фронту). Першае баявое хрышчэнне Іван Астапук прыняў на Прыпяці ў раёне ўкраінскага горада Ратна, з баямі прыйшоў на тэрыторыю Маларыцкага раёна, дзе вайсковая часць, у якой ён служыў, дыслацыравалася ў лесе каля вёскі Замшаны. Пасля вызвалення Маларытчыны дывізія абышла Брэст з поўдня, фарсіравала раку Заходні Буг і ўжо з польскай тэрыторыі атакавала нямецкі гарнізон у Брэсце, вызваліўшы горад 28 ліпеня 1944 года.*

Пасля з цяжкімі баямі ішлі наперад, на Варшаву, але горад тады вызваліць не змаглі. Як успамінае Іван Аляксандравіч, 17 дзён і начэй яны ляжалі і сядзелі на зямлі пад пастаяннымі абстрэламі ворага. Часам падымалі над галавой сапёрную рыдлёўку, якую ў той жа момант прабівала куля нямецкага снайпера. 13 жніўня Іван Аляксандравіч быў паранены ў нагу каля польскай вёскі Кура. Пасля ранення лячыўся ў шпіталі ў Рэчыцы, а затым зноў фронт — стралком-аўтаматчыкам у складзе 20-й гвардзейскай механізаванай брыгады 1-й танкавай арміі. 14 студзеня 1945 года прымаў удзел у наступленні на Сандамірскім плацдарме. Ваяваў ва Усходняй Прусіі, Памераніі, за выхад да Балтыйскага мора, удзельнічаў у баях на Зеелаўскіх вышынях, фарсіраваў раку Шпрэе, штурмаваў Берлін. Узнагароджаны баявымі медалямі «За вызваленне Варшавы», «За адвагу», «За ўзяцце Берліна».

Пасля вайны Іван Астапук служыў у цэнтральнай камендатуры Берліна, быў дэмабілізаваны толькі ў 1949 годзе. Вярнуўшыся ў родную вёску Высокае, працаваў рахункаводам у калгасе, паштальёнам. З 1954-га ён — настаўнік фізічнай культуры і працоўнага навучання Высокаўскай сямігадовай, потым васьмігадовай, базавай школы. З жонкай Хрысцінай Данілаўнай выхавалі чацвярых дзяцей. «Трэба жыць і рухацца» — такі дэвіз ветэрана. Невыпадкова ён і сёння ездзіць на ровары, коле дровы і з задавальненнем чытае газеты.

Прадзед

Пра свайго прадзеда — Героя Савецкага Саюза — напісала Дзіяна Свірыдзюк з Кобрына. Дарэчы, гарадская сярэдняя школа №2 носіць імя Уладзіміра Кірмановіча. Імя Героя прысвоена і адной з вуліц Кобрына.

«У 21 год Уладзімір Мікалаевіч быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі, — піша праўнучка. — У адным з баёў быў паранены, але гэта не спыніла маладога адважнага байца. Пасля шпіталя Уладзімір Мікалаевіч зноў адправіўся на фронт. Быў камандзірам знішчальна-супрацьтанкавай батарэі 202-й танкавай брыгады 19-га танкавага корпуса 51-й арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту. У адным з баёў яго батарэя знішчыла 6 варожых танкаў, вялікую колькасць нямецкіх салдат і афіцэраў. Ваяваў на Бранскім, Цэнтральным, Паўднёвым, 4-м Украінскім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх франтах, удзельнічаў у бітве на Курскай дузе, у баях за Прыбалтыку, вызваляў Украіну і Крым. За праяўленую мужнасць і гераізм у 1945 годзе Уладзімір Кірмановіч быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Пасля вайны прадзядуля скончыў авіяцыйнае аддзяленне Ваеннай акадэміі імя Фрунзэ. Нёс службу ў радах Савецкай Арміі, выкладаў у розных навучальных установах. У 1974 годзе ў званні палкоўніка быў звольнены ў запас. Апошнія гады свайго жыцця Герой Савецкага Саюза са сваёй жонкай Еўдакіяй жылі ў Харкаве, што ва Украіне, і рэдка прыязджалі на радзіму».

Свайго прадзядулю-героя Дзіяна ніколі не бачыла: у 2001 годзе, калі яна нарадзілася, Уладзіміра Кірмановіча не стала.

Аднавяскавец

«Наш герой» — так называюць ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Дзмітрыя Войтава не толькі аднавяскоўцы-старажылы, але і навучэнцы Курманаўскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад — сярэдняя школа, які знаходзіцца ў Мсціслаўскім раёне Магілёўскай вобласці. Школьнікі сабралі шмат матэрыялаў пра аднавяскоўцаў, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, пра вязняў, аднавілі імёны салдат, якія загінулі на палях баёў, імёны тых, хто пахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Каменка. Пра ваенны лёс Дзмітрыя Войтава даведаліся і мы.

«Дзмітрый Фёдаравіч нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 19 гадоў быў прызваны ў Чырвоную Армію. У складзе сфарміраванай маршавай роты камсамолец накіраваўся ў бок Смаленска. Курс маладога байца прайшоў у стралковым палку ў Сараташе. Ваяваў пад Старую Русаю на Пскоўшчыне, дзе быў упершыню паранены. Прымаў удзел у вызваленні Смаленска. Адзначыўся ў Беларускай наступальнай аперацыі «Багратыён».

Як разведчык, Дзмітрый Войтаў умеў хутка арыентавацца ў незвычайных абставінах, выкарыстоўваць набыты за час вайны вопыт, прыродную знаходлівасць, вылічваў агнявыя кропкі ворага, знянацку браў фашыстаў у палон. У адным з узнагародных лістоў запісана, што Дзмітрый Войтаў, разведчык 213-га гвардзейскага палка 71-й стралковай дывізіі, 22 сакавіка 1944 года ў раёне вёскі Глухаўка, выконваючы заданне камандавання па выяўленні агнявых сродкаў і сіл ворага, з групай разведчыкаў незаўважна падпоўз да траншэі ворага і першым уварваўся ў яе, знішчыўшы чатырох немцаў. У рукапашнай барацьбе быў паранены камандзір яго ўзвода. Пад моцным агнём Дзмітрый Фёдаравіч вынес цяжка параненага камандзіра, чым выратаваў таго ад смерці.

У чэрвені гэтага ж года старшына Войтаў з групай разведчыкаў прабраўся ў тыл ворага і разам з імі знішчыў пяцярых фашыстаў і аўтамашыну. Сярод забітых быў нямецкі палкоўнік, дакументы якога аказаліся вельмі важнымі. У лютым 1945 года Дзмітрый Войтаў зноў паказаў сябе сапраўдным героем: на ратным полі знішчыў дзве агнявыя кропкі, узяў у палон трох гітлераўцаў».

Аўтары ўпэўнены: усе подзвігі гэтага чалавека не пералічыць. Аб тым, якім быў салдат Перамогі, гавораць яго ўзнагароды. А пра тое, якім чалавекам быў Дзмітрый Фёдаравіч, узгадваюць яго аднавяскоўцы. Узгадваюць толькі добрым словам. І ганарацца ім, сваім героем.

Тата

У Галіны Шаўчэнкі з Мінска — свой герой. *«Вайна жыве ўва мне, бо я дачка салдата, які адправіўся на яе добраахвотнікам і прайшоў цяжкімі дарогамі ад Каўказа да Берліна»*, — піша жанчына пра свайго бацьку Івана Шаўчэнку 1923 года нараджэння.

Іван Цітавіч, па яе словах, не вельмі любіў распавядаць пра вайну, затое з вялікім гонарам расказваў пра сваіх франтавых сяброў, згадваў пра акопную паўсядзённасць. Быў неаднойчы паранены і кантужаны. Лейтэнант Шаўчэнка ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, чытырма баявымі медалямі, адзначаны шматлікімі падзякамі.

«Калі мы, дзеці, хацелі даведацца за што, тата, пасміхаючыся, пераходзіў на аповед пра свайго брата Мікалая, радавога, які меў два медалі «За адвагу», ордэн Славы III ступені, ордэн Чырвонай Зоркі і шэраг медалёў. «У нас — казацкая костачка», — казаў тата, згадваючы свайго дзеда Емяльяна, узнагароджанага за балгарскую кампанію чатырма Георгіеўскімі крыжамі. Далей ішоў расповед пра казацтва і расказачванне, голад 1933 года на Кубані, адкуль ён быў родам. А таксама пра вернасць, адданасць, абавязак і веру... Пра арышт майго дзеда Ціта Емяльянавіча, які загінуў на будаўніцтве Беламорканала. Пра сіроцтва, пра паняцце «сын ворага народа»...»

...Здаецца, зусім непадобныя адна на адну гісторыі. Абсалютна розныя людзі. Аднак усе яны — героі. Героі вялікай дзяржавы, пэўнай мясцовасці, канкрэтнай сям'і. Многіх ужо няма на гэтым свеце, аднак памяць пра іх засталася. Усе яны — без выключэння — гэтага заслугоўваюць.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

■ Зусім сакрэтна

СПУСТОШАНЫЯ ЖЫТНІЦЫ

Калі ў СССР людзі паміралі ад голаду, Сталін забяспечваў збожжам Еўропу

Уладзіміра Станкевіча, селяніна-серадняка з вёскі Навасёлкі Гуслішчанскі сельсавет Магілёўскага раёна абклаў цвёрдым заданнем у непад'ёмным памеры. Высвятляць абставіны ніхто не стаў, і за яго невыкананне ў селяніна аднялі апошнюю карову і ўвесь пасяўны матэрыял, пакінуўшы мужчыну нават без крошкі хлеба. Праз гэта небарака памёр ад разрыву сэрца: Станкевіч ужо не мог карміць сваю сям'ю. Яго жонка вымушана была прасіць міласціну ў суседзяў, вымольваючы па дзве-тры бульбінкі і, зварыўшы адзін гаршчок, гэтым жыць з чацвярымі дзецьмі цэлыя суткі.

ЭКСПАРТ НА ФОНЕ НЕДАЯДАННЯ

Іншы селянін, жыхар вёскі Адасі Конкавіцкага сельсавета Петрыкаўскага раёна Фёдар Шляга, усю руска-германскую вайну знаходзіўся на фронце і апошнія два гады ў палоне. За гэты час яго гаспадарка прыйшла ў заняпад. Вызваліўшыся з палону ў 1919 годзе, Шляга пакрысе стаў падымаць яе і да 1931 года плаціў сельгаспадатак. Аднак у 1930 годзе ўся яго зямля адышла да калгаса, а ўзамен селянін атрымаў кавалак неўрадлівага надзела, і той ён мог засеяць толькі напалову, бо меў мала скаціны. А тут яшчэ засуха, якая прывяла да поўнага неўраджаю як хлеба, так і бульбы...

Нягледзячы на такое становішча, сельсавет абклаў Фёдара Шлягу цвёрдым заданнем. Селянін здаваў усё да апошняга, апроч, хіба, жыта — іначай не было б чым карміць сям'ю. Але кіраўніцтва было няўмольным і наклала на небараку штраф. Запатрабаваўшы квітанцыі аб сплачванні задатку, сельсавет адняў іх і не вярнуў, таму ў дадатак да ўсёй бяды Шлягу прысудзілі 6 месяцаў прымусовай працы.

Такія вынікі прынесла беларускім сялянам калектывізацыя, якая ва ўяўленні кіраўніцтва краіны не толькі мусіла забяспечыць рост сельскагаспадарчай вытворчасці, але, галоўнае, павялічыць яе таварнасць. Бо, напрыклад, у 1930 годзе быў запланаваны экспарт больш як 5 мільёнаў тон савецкага збожжа ў Заходнюю Еўропу — каб атрымаць валюту на патрэбу індустрыялізацыі.

Гэтым планам савецкага кіраўніцтва не перашкодзіла ўстойліва напружанае становішча з забеспячэннем хлебам насельніцтва, якое пачалося з чэрвеня 1931 года ў БССР. Нормы па забеспячэнні былі моцна зменшаныя. Не толькі гараджане, але нават сяляне, якія, здавалася, жылі хлебам і на хлебе, насамрэч яго таксама амаль не бачылі. У калгасах да чацвёртага квартала 1931 года адпускалася 9,3 тоны хлеба на квартал, пасля гэтая норма скарацілася да 1 — 1,2 тоны.

Ці адмовілася ў гэтых умовах дзяржава ад паставак хлеба ў Еўропу? Зусім не, наадварот, планы па экспарце павялічылі ў некалькі разоў. У пачатку 1930 года СССР адправіў у Англію, Італію, Германію, Бельгію і іншыя краіны больш за 12 мільёнаў тон збожжа. Адметна тое, што пра такое супрацоўніцтва, якое вялося на фоне голаду мільёнаў савецкіх сялян, было шырока вядома ў свеце, а ў СССР, вядома ж, замоўчвалася. Гэта прывяло да таго, што на краіну абрынуўся вялікі голад, пік якога прыпаў на 1933 год.

«СТАНОВІШЧА КАТАСТРАФІЧНАЕ»

Дырэктар беларускага садова-агароднага трэсту Самохін у 1932 годзе дакладваў сакратару ЦК Кампартыі Беларусі Гікалу:

«Становішча з хлебам вельмі напружанае, а па асобных саўгасах катастрафічнае, што можа прывесці да поўнага зрыву работы. Гэткае здарылася таму, што саўгасы да першага чэрвеня атрымлівалі хлеба толькі 50% ад сваёй патрэбы, а пасля першага чэрвеня зусім не атрымалі. Праз гэта ўвесь час прыходзілася даваць толькі палову нормы, г. зн. 300 — 400 грамаў на дзень, а ў чэрвені нормы знізіць да 200 грамаў на суткі, і цяпер я маю тэлеграмы ад большасці саўгасаў, што хлеба зусім няма і выдача яго спынена. У выніку чаго назіраецца валавы невыхад на работу, выхад з саўгасаў і падзенне працоўнае дысцыпліны».

Не лепшай за сялян была сітуацыя ў рабочых. Яны скардзіліся на голад, нізкія заробкі (70 рублёў замест абяцаных 130, і тыя скарачаюцца), картачную сістэму.

У 1930—1932 гадах асноўны вываз хлеба прыпаў на Украіну, Паўночны Каўказ, Паволжа і Цэнтральна-Чарназемны раён. У 1932—1933 гадах менавіта гэтыя раёны сталі зонай масавага смяротнага голаду. Сумны парадокс заключаўся ў тым, што найбольшая колькасць галодных смерцяў фіксавалася менавіта ў найбольш ураджайных раёнах — бо адсюль забіралі больш збожжа, чым з астатніх, вывозілі ўсё дачыста.

У пачатку 1932 года сталінскае кіраўніцтва ўсведамляе наяўнасць у краіне глыбокага харчовага крызісу і прымае паслабленчыя меры. Вясной абвяшчаецца права вольнага гандлю хлебам для калгасаў. Аднаасобнікам, якія выканалі планы, дазваляецца развіваць у вёсках асабістыя падсобныя гаспадаркі. Але было ўжо запозна: да гэтага часу ў эпіцэнтры смяротнага голаду апынулася больш за 50 мільёнаў чалавек...

Што да Беларусі, то масавы голад ахапіў тут пераважна паўднёвыя раёны: з дакументаў вядома, што ў адным толькі Нараўлянскім раёне за 1932—1933 гады ад недаядання памерла да 1000 чалавек. Разам з тым прыводзяцца звесткі і аб голадзе ў цэнтральных раёнах БССР.

У 1933 годзе сітуацыя стала крыху паляпшацца і найбольш пацярпелыя рэгіёны атрымалі большыя, чым летась, збожжавыя і харчовыя пазыкі, экспарт збожжа з СССР быў прыпынены, і яго сэканомленыя рэшткі накіравалі на ўнутраныя патрэбы.

Дзіяна СЕРАДЗЮК. *seradzyuk@zviazda.by*
Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ
■

■ Гарачая кропка

КАБ АДПАЧЫНАК НЕ СТАЎ ЗАНАДТА ГАРАЧЫМ

падчас падарожжаў па Турцыі будзьце ўважлівымі

Турцыя для нашых суайчыннікаў застаецца адным з самых папулярных напрамкаў для летняга адпачынку. Тым не менш на мінулым тыдні Міністэрства спорту і турызму, на падставе інфармацыі МЗС, параіла суайчыннікам, што збіраюцца наведаць Турцыю, адмовіцца ад паездак у правінцыі, сумежныя з Сірыяй і Іракам. Аргументавалася гэта тым, што там улады гэтай краіны праводзяць антытэрарыстычную аперацыю.

У той жа час, па інфармацыі Міністэрства замежных спраў нашай краіны, становішча ў традыцыйных зонах адпачынку ў Турцыі застаецца спакойным, «турэцкімі ўладамі прымаюцца ўсе неабходныя захады па забеспячэнні бяспекі на ўсёй тэрыторыі Турцыі». Значыць, ехаць туды можна, але асцярожна.

Як паведамляецца, з пачатку правядзення антытэрарыстычнай аперацыі праваахоўныя органы Турцыі затрымалі па ўсёй краіне больш за 1300 чалавек. Затрыманыя падазраюцца ў сувязях з «Ісламскай дзяржавай Ірака і Леванта», Рабочай партыяй Курдыстана (РПК) і тэрарыстычнай групоўкай «Рэвалюцыйная народна-вызваленчая партыя-фронт».

Падчас аперацыі ваенна-паветраныя службы Турцыі знішчылі ваенны лагер Рабочай партыі Курдыстана «Хакурк» на поўначы Ірака. Раней ВПС Турцыі нанеслі ўдар па лагеры РПК «Метына» на поўначы Ірака.

Тым часам у Бруселі адбыліся кансультацыі ў рамках НАТА па пытаннях падтрымання бяспекі ў Турцыі. Савет НАТА адкрыта асудзіў гэтыя напады і паказаў, што застаецца салідарны з Турцыяй у рамках прынцыпу непадзельнасці калектыўнай бяспекі альянсу.

Урад Турцыі прыняў рашэнне аб правядзенні антытэрарыстычнай аперацыі пасля шэрагу тэрактаў, арганізаваных на тэрыторыі краіны. Сітуацыя ў краіне абвастрылася на мінулым тыдні, калі баевікі «Ісламскай дзяржавы» здзейснілі тэракт на мяжы Турцыі і Сірыі. У сувязі з аперацыяй турэцкія спецслужбы папярэдзілі насельніцтва аб высокай верагоднасці тэрактаў на паўднёвым усходзе краіны, а таксама ў Стамбуле.

Тэракты не прымусілі сябе чакаць. У мінулыя выхадныя ва ўсходняй правінцыі Турцыі Аргы экстрэмісты Рабочай партыі Курдзістана ўчынілі тэрарыстычны акт ля мясцовага аддзялення жандармерыі. Тэрарыст пад'ехаў да будынка на трактары з дзвюма тонамі выбухоўкі. Двое паліцэйскіх загінулі, 24 паранены. Экстрэмісты абстралялі і машыну хуткай дапамогі, якая ехала на месца тэракта. Яшчэ адзін выбух адбыўся ў правінцыі Мардзін, на мяжы з Сірыяй. Загінуў адзін турэцкі ваенна-служачы, чацвёра паранены.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■

ЧОРНАЯ ПАЛОСКА Ў ЖЫЦЦІ... ЗЕБРЫ

Ветэрынары Гродзенскага заапарка змагаюцца за жыццё Бобі. На жаль, прагнозы несуцяшальныя. Прычына хваробы гадавалага самца зебры не новая: кармленне з рук наведвальнікаў, паведамілі ў адміністрацыі заапарка.

Колькі разоў гаварылася аб недапушчальнасці кармлення жывёл наведвальнікамі, колькі папераджальных таблічак «Не карміць!» размешчана на тэрыторыі заапарка, але, на жаль... Пасля выхадных у Бобі ўспышыўся жывот. Гэта, кажуць ветэрэнары, сведчыць аб моцным браджэнні ў арганізме. Апошняе справакавана няправільным кармленнем. Браджэнне ў страўніку вельмі небяспечнае: ён пачынае ціснуць на сэрца і лёгкія. І ў выніку жывёла гіне ад удушша. Бобі зараз вельмі цяжка: уколы, строгая дыета. Нягледзячы на тое, што ў яго стане трэба шмат рухацца, ветурачы заапарка забараняюць яму гуляць на вуліцы, справядліва баючыся паўторнага атручвання чарговым «ласункам». Вельмі пакутуе і самачка Бэбі. Бо ўсе абмежаванні, звязаныя з хваробай сябра, яна перажывае разам з ім: не ходзіць гуляць і прытрымліваецца дыеты.

Хлеб, цукеркі ды садавіну жывёлы ў наведвальнікаў будуць выпрошваць заўсёды, кажуць у адміністрацыі заапарка. Не таму, што галодныя, а таму што для іх гэта ласунак, шкоду якога для свайго арганізма ўсвядоміць ніколі не змогуць. А вось ці змогуць людзі?

Надзея ПАЎЛАВА.

■ Асцярожна!

Беражыся ўкусаў

Па інфармацыі гарадской санэпідслужбы, за шэсць месяцаў бягучага года па медыцынскую дапамогу звярнуліся 1700 мінчан, якія пацярпелі ад укусаў жывёл, што маглі хварэць на шаленства. Дзеці і падлеткі ва ўзросце да 18 гадоў складаюць 20% ад агульнай колькасці пацярпелых.

Як і ў папярэднія гады, большасць з тых, хто звярнуўся па антырабічную дапамогу, пацярпелі ад укусаў сабак (42%) і катоў (26%), якія маюць гаспадароў. А 4% пацярпелых звярнуліся з нагоды траўмаў, нанесеных ім дзікімі жывёламі (ваўком і лісіцай).

Лячэбна-прафілактычныя прышчэпкі супраць шаленства былі прызначаны 72% пацярпелых, якія звярнуліся з нагоды ўкусаў. Камбінаванае лячэнне з выкарыстаннем антырабічнага імунаглабуліну прызначалася ў 25% выпадкаў. Адмовіліся ад лячэбна-прафілактычнай вакцынацыі 0,5% ад колькасці асоб, якім прызначалася антырабічнае лячэнне.

У сувязі з гэтым медыкі нагадваюць: калі кантакту з жывёлай, нават вонкава здаровай, пазбегнуць не атрымалася, неабходна ў максімальна кароткія тэрміны самастойна правесці першасную апрацоўку раны — старанна прамыць раневую паверхню (скуру) на працягу 15 хвілін струменем вады з мылам, апрацаваць краі раны 5-працэнтнай настойкай ёду і неадкладна звярнуцца ў медыцынскую ўстанову. Толькі лекар можа ацаніць рызыку магчымага заражэння вірусам шаленства і прызначыць, пры неабходнасці, курс антырабічнага лячэння. Варта памятаць: чым раней пачаты гэты курс, тым больш верагодны шчаслівы зыход. Чалавека, які ўжо захварэў на шаленства, выратаваць немагчыма.

Выпадкі захворвання на шаленства сярод жывёл на тэрыторыі Мінска за 6 месяцаў 2015 года не рэгістраваліся. Але за студзень—чэрвень 13 жыхароў сталіцы кантактавалі з хворымі на шаленства дзікімі і свойскімі жывёламі. Усе кантакты адбыліся за межамі горада.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Зварот у рэдакцыю

БАРАЦЬБА ЗА ДАМАФОН

Узнікае канкурэнцыя за права абслугоўвання запорна-перамоўнага абсталявання

У рэдакцыю «Звязды» звярнуўся жыхар аднаго з дамоў па сталічнай вуліцы Герасіменкі. Ён распавёў, што знайшоў у сваёй паштовай скрынцы дзве ўлёткі. Адна з іх агітавала перазаключыць дамову на абслугоўванне дамафоннай сістэмы з УП «ЖРЭА Заводскага раёна», іншая заклікала да таго, каб працягваць супрацоўнічаць з прыватнай арганізацыяй. Абедзве ўлёткі ўтрымлівалі аргументы на карысць пэўнага боку. У сітуацыі разбіраўся карэспандэнт «Звязды».

Пра тое, што ўсе сталічныя пад'езды неабходна абсталяваць дамафонамі і кодавымі замкамі для таго, каб абмежаваць доступ у іх непажаданым людзям, пачалі гаварыць яшчэ ў канцы 1990-х гадоў. Неўзабаве запрацавала дзяржаўная праграма «Закрыты пад'езд» і на ўваходзе ў мінскія дамы стала ўсё больш з'яўляцца металічных дзвярэй. Праграма рэалізоўвалася сіламі шматлікіх недзяржаўных арганізацый. Сёння ж на сталічным рынку абслугоўвання дамафонных сістэм працуюць некалькі дзясяткаў індывідуальных прадпрымальнікаў і прыватных фірм. А нядаўна да іх далучыліся і дзяржаўныя арганізацыі — раённыя ЖРЭА. І канкурэнцыя за кліента абвастрылася.

Прадстаўнік ЖРЭА:

«Жыхары маюць права выбару абслуговай арганізацыі»

— Да гэтага года ў нас дзейнічала спецыяльная дамова з усімі арганізацыямі, якія абслугоўваюць у раёне дамафонныя сістэмы, — расказаў «Звяздзе» **намеснік дырэктара па эксплуатацыі жыллёвага фонду — кіраўнік службы заказчыка УП «ЖРЭА Заводскага раёна Мінска» Юрый ГУР**. — Сума за абслугоўванне запорна-перамоўнага абсталявання выстаўлялася ў агульныя плацежкі — так званыя «жыроўкі». Але ў студзені дамовы з прыватнымі арганізацыямі былі скасаваны. Зараз жа яны дасылаюць асобныя квітанцыі за свае паслугі. А вось калі дамафонная сістэма абслугоўваецца ЖРЭА, то плата за яе ўключаецца ў агульную жыроўку.

— Ва ўлётцы, якая заклікае заключаць дамовы са ЖРЭА, сказана: «Паслугі па тэхнічным абслугоўванні дамафоннай сістэмы прадастаўляюцца без пасярэднікаў пры заключэнні індывідуальнага дагавора ўласнікам (наймальнікам) жылога памяшкання з УП «ЖРЭА Заводскага раёна горада Мінска». Ці так гэта насамрэч?

— Якая арганізацыя будзе абслугоўваць канкрэтнае ўстройства, вырашаюць самі жыхары. На аказанне гэтай паслугі якіх-небудзь датацый дзяржава не выдзяляе. Таму яна адносіцца да дадатковых. Яе можа аказваць як ЖРЭА, так і прыватная арганізацыя. І калі жыхары згодныя на тое, каб іх дамафон абслугоўвала прыватная арганізацыя, гэта іх законнае права. Для гэтага патрэбна, каб большасць уласнікаў або наймальнікаў кватэр заключыла з арганізацыяй індывідуальныя дагаворы. І калі такіх дагавораў назбіралася больш за палову ад агульнай колькасці кватэр у пад'ездзе, пытанне абслугоўвання вырашаецца на карысць гэтай арганізацыі. Меншасць жа мусіць падпарадкавацца выбару большасці. Бо не існуе тэхнічнай магчымасці, каб у адным пад'ездзе адну і тую ж сістэму абслугоўвалі розныя фірмы.

«Мы ні ў якім разе не супраць канкурэнцыі, бо яна — рухавік прагрэсу. Галоўнае, каб яна была добрасумленнай».

— У вышэйзгаданай улётцы ёсць адзін цікавы пункт. У ім заклікаюць, каб людзі цікавіліся дакументамі прадстаўнікоў прыватных фірм, якія абслугоўваюць дамафоны. Прывяду цытату: «Хто яны, адкуль, ці ёсць у іх дазвол і дакументы аказваць паслугі, тэхналагічныя карты, калькуляцыя выдаткаў, тэхнічны рэгламент на работы, тэхнічныя ўмовы». Асобна вылучаны дагавор на электрычнае забеспячэнне дадатковай сістэмы.

— Ёсць прыватныя арганізацыі, якія сумленна працуюць не адзін год. Але нам вядома, што шмат прапаноў паступае ў апошні час ад індывідуальных прадпрымальнікаў, у якіх няма паўнавартаснай базы. Яны заключаюць дамовы з жыхарамі і пасля кудысьці знікаюць. Жыхары ж пасля тэлефануюць нам. А мы ў такім разе да дамафона ніякага дачынення не маем увогуле. Таму разгляд дакументаў — цалкам лагічны крок. Электраэнергія вылучана асобна, бо дамафонная сістэма яе пастаянна спажывае. І калі такую сістэму абслугоўвае прыватнік, ён уключае ў выніковую калькуляцыю тарыфаў выдаткі на электраэнергію.

Прыватная арганізацыя:

«Мы за добрасумленную канкурэнцыю»

Па каментарый карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да **Сяргея КУЛІКА, дырэктара адной з прыватных фірм**, якія займаюцца абслугоўваннем запорна-перамоўнага абсталявання.

— Патлумачце, калі ласка, на які трохбаковы дагавор спасылаецца прадстаўнік ЖРЭА?

— Гісторыя з дагаворамі, заключанымі паміж камерцыйнымі прадпрыемствамі, Цэнтрам інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама і раённымі ЖРЭА цягнецца ад 2007 года. Менавіта тады Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі загадала, каб усе прадпрыемствы, якія абслугоўваюць дамафонныя сістэмы, рабілі налічэнні за аказаныя паслугі праз адзіныя рахункі-паведамленні. Але ў студзені 2015 года трохбаковыя дагаворы скасавалі прадстаўнікі трох сталічных ЖРЭА — Заводскага, Кастрычніцкага і Першамайскага раёнаў. Да таго ж яшчэ ў 2013 годзе тэхніка-эканамічны савет Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі вырашыў адпаведнай пастановай пашырыць аб'ёмы аказання платных паслуг насельніцтву.

— І цяпер пачалася «вайна ўлётак», якія агітуюць за заключэнне дамоў з рознымі арганізацыямі.

— Мы ні ў якім разе не супраць канкурэнцыі, бо яна — рухавік прагрэсу. Галоўнае, каб яна была добрасумленнай. І вось тыя ўлёткі, аб якіх вы кажаце, нас засмучваюць, бо ў іх часам змяшчаецца інфармацыя, што нас ганіць. Пры гэтым на ўлётках ніякіх выхадных звестак не надрукавана.

— Як, на ваш погляд, выйсці з гэтай няпростай сітуацыі?

— Прыватныя арганізацыі, якія абслугоўваюць дамафонныя сістэмы ў горадзе, аб'ядналіся ў асацыяцыю «Бяспечны дом». Некалькі месяцаў таму яна накіравала ва ўпраўленне гарадской гаспадаркі Мінгарвыканкама план мерапрыемстваў, якія прадугледжваюць магчымасць стварэння аднолькавых умоў для канкуруючых арганізацый датычна паслуг па абслугоўванні запорна-перамоўнага абсталявання. Без дыялогу «на роўных» ніякага канструктыўнага выніку не будзе.

— У Заводскім раёне горада пабудавана мноства шматпад'ездных дамоў. Ці існуюць сітуацыі, калі дамафоны, усталяваныя ў розных пад'ездах, абслугоўваюць розныя фірмы?

— Безумоўна. І гэта нармальна, бо так захацелі жыхары пад'езда. Гэта і ёсць сумленная канкурэнцыя.

«Якая арганізацыя будзе абслугоўваць канкрэтнае ўстройства, вырашаюць самі жыхары... І калі жыхары згодныя на тое, каб іх дамафон абслугоўвала прыватная арганізацыя, гэта іх законнае права».

Барацьба «за кліента», як бачым, узрастае. Самае ж галоўнае, каб у гэтай барацьбе не пацярпелі самі спажыўцы. І пажадана, каб сэрвіс быў на належным узроўні, што, дарэчы, ад канкурэнцыі і патрабуецца.

Валяр'ян ШКЛЕННІК
schklennik@zviazda.by

■

Віктар РУСАК:

■ Меркаванне

«МЫ З САМАГА ПАЧАТКУ ПРЫТРЫМЛІВАЕМСЯ КУРСУ МІРНАГА ЎРЭГУЛЯВАННЯ ЛЮБЫХ КАНФЛІКТАЎ»

Сённяшняя дата сумна вядомая як Дзень Хірасімы — 70 гадоў таму амерыканскі бамбардзіроўшчык скінуў на японскі горад Хірасіма атамную бомбу. Цяпер 6 жніўня адзначаецца як Сусветны дзень барацьбы за забарону ядзернай зброі. Наша краіна ў сусветнай супольнасці вядома не толькі як бяз'ядзерная дзяржава, але і як дзяржава, якая значныя намаганні прыкладае для таго, каб і іншыя краіны свету адмовіліся ад зброі масавага знішчэння.

Нагадаем, у чэрвені 1993-га Беларусь афіцыйна далучылася да Дагавора аб нераспаўсюджанні ядзернай зброі, а ў 1996—1997 гадах завяршыўся вывад яе з тэрыторыі краіны. Трэба падкрэсліць, што Беларусь адмовілася ад валодання самым сучасным ваенным ядзерным патэнцыялам без усялякіх папярэдніх умоў. Гэтым мы фактычна паклалі пачатак працэсу ўрэгулявання пытанняў ядзернага раззбраення на постсавецкай прасторы ў інтарэсах міжнароднага міру і бяспекі. Парламентарый **Віктар РУСАК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы**, расказаў, наколькі важна для нашай краіны тое, што ў свой час мы адмовіліся ад ядзернай зброі.

— 70 гадоў таму ў свеце мала хто зразумеў, што адбылося ў гэты дзень. Прагучала, што была ўзарвана бомба магутнасці дагэтуль нябачанай, але падчас вайны гэта не бог ведае якая падзея, па вялікім рахунку. Жах ад усвядомленага наступіў з-за таго, што чалавецтва ўступіла ў іншую эру і атрымала зброю, легкадумнае стаўленне да якой можа вызваць глабальныя катастрофы. Не проста нейкія разбурэнні, не проста смерць вялікай колькасці людзей, а менавіта глабальныя праблемы для ўсёй нашай планеты.

Спыніць навукова-тэхнічны прагрэс, відаць, не ўдасца нікому, ды і не трэба гэтага рабіць. Але ўся гісторыя чалавецтва паказвае, што няма, відаць, хоць трохі сур'ёзнай тэхнічнай вынаходкі, якую ў той ці іншай ступені не спрабавалі б выкарыстаць у шкоду чалавеку. Гэта пачалося, відаць, яшчэ з той пары, калі адзін узяў у рукі палку для таго, каб збіць арэх, а другі яе ўзяў для таго, каб адабраць гэты арэх. Сёння, як вы разумееце, мы маем справу не з палкамі, нават не з порахам і не з дынамітам, а са зброяй абсалютна іншага класа і іншай ідэалогіі. Навукова-тэхнічны прагрэс будзе развівацца, і ў тым ліку, хочам мы гэтага ці не, будзе ўдасканальвацца і зброя.

Віктар Русак упэўнены, што ў такой сітуацыі асаблівую ролю адыгрывае ўсведамленне палітыкамі адказнасці.

— Асабліае значэнне набывае маральная адказнасць як вядучых палітыкаў, так і ўсёй сусветнай супольнасці. Адказнасць кіраўніцтва нашай краіны, маральная адказнасць усяго беларускага народа — гэта тое, што з самага пачатку мы заявілі, што будзем няўхільна прытрымлівацца курсу мірнага ўрэгулявання любых, нават самых складаных, заблытаных канфліктаў. Мы верныя тым абавязкам, што ўзялі на сябе. І, відаць, гэта адна з прычын, па якой мы дабравольна адмовіліся ад захавання на сваёй тэрыторыі ядзернай зброі.

Парламентарый назваў і выгады, якія прынесла адмова ад ядзернай зброі.

— Па-першае, палітычны аспект. Мы, заставшыся вернымі ўзятым на сябе абавязацельствам, можам з любой дзяржавай, арганізацыяй гаварыць і закранаць самыя далікатныя пытанні захавання, распаўсюджвання і выкарыстання ядзернай зброі. Мы маем на гэта права, мы адмовіліся ад яе, чым далі прыклад і іншым.

Другі момант — ён у нечым, можа, і прагматычны. Утрыманне ядзернай зброі, рэгламентныя работы, захаванне, замена — гэта дарагое задавальненне.

Трэці момант — думаю, вам даводзілася чуць, што наяўнасць ядзернай зброі аблягчае працэс вядзення перамоў па асобных палітычных пытаннях. Гэта ўсё роўна як пісталет у кішэні, калі чалавек раптам апынуўся сярод бандытаў. Але гэта двухбаковавострая рэч. Бо калі прывесці тую ж самую аналогію з бандытамі, то няправільны жэст можа прывесці да тваёй гібелі. Яны ведаюць, што ў цябе ёсць зброя, і могуць спрацаваць на апераджэнне. Гэтак жа і ў палітыцы: наяўнасць ядзернай зброі робіць цябе ўразлівым аб'ектам. Вельмі высокая верагоднасць, што супраць цябе ж гэта зброя можа быць прыменена, што прывядзе да вельмі сур'ёзных наступстваў.

Але чаму я паставіў на першае месца менавіта палітычны аспект? Кіраўніцтва нашай краіны не раз заяўляла, што мы катэгарычна не прымаем сілавых метадаў вырашэння палітычных пытанняў, канфліктаў, у тым ліку і з прымяненнем зброі масавага знішчэння. У краіне робіцца максімальна магчымае для рэалізацыі гэтага тэзіса — пачынаючы з пазіцыі і неаднаразовых выступленняў кіраўніка дзяржавы і заканчваючы неабходнай заканадаўчай базай.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ З месца падзей

ЛЕС І ПОЛЫМЯ

У Асіповіцкім раёне змагаюцца з лясным пажарам. Агонь ліквідоўвалі нават з верталётаў, але пакуль канчаткова не знішчылі. З эпіцэнтра падзей перадаюць карэспандэнты «Звязды».

У гэтых мясцінах Асіповіцкага раёна лес багаты на ягады. На станцыі Вярхі, якая прымыкае да самага лесу, з электрычак пастаянна выходзяць дзясяткі ягаднікаў і грыбнікоў. Ад лесу многія чакалі ўраджаю, а атрымалі — пажар, які сваім дымам нават паспеў напалохаць жыхароў сталіцы.

— Інфармацыя аб пажары на мяжы Цэльскага і Асіповіцкага лясніцтваў паступіла ў суботу. Мы адразу ўзяліся за яго тушэнне, — кажа **Аляксандр КУЛІК, першы намеснік міністра лясной гаспадаркі**, з якім мы сустрэліся ў штабе, што разбілі непадалёк ад чыгункі. — Адразу агульная плошча пажару складала паўтара гектара, а пасля ён разышоўся па мху і верасе. Цяжкасць у тым, што тут балоцістая мясцовасць і наша тэхніка ў ёй «садзіцца». Прыйшлося задзейнічаць верталёты Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, з якім мы шчыльна супрацоўнічаем. Працавалі тры, цяпер застаўся адзін (размова адбылася ў аўторак. — **Аўт.**), які апрацоўвае ачагі агню. Сёння ў лесе дзейнічаюць 200 спецыялістаў лясной аховы, больш за 20 прадстаўнікоў МНС. Працуе тэхніка. Сітуацыя пад кантролем, пажар лакалізаваны. Аднак тушыць будзем да поўнай ліквідацыі. Ці пагражаў ён чыгункі? Не, для нас галоўным было не пусціць яго ў сасновыя пасадкі.

У **Віктара ДАМАРАДА, галоўнага ляснічага Асіповіцкага вопытнага лясгаса**, мабільны літаральна плавіцца ад званкоў. Яны раздаюцца пастаянна. Разам з ім мы паглыбляемся ў лес, дзе працуюць дзясяткі лясных ахоўнікаў. З кожным крокам усё больш і больш адчуваем едкі дым, дзесьці непадалёк гудзіць верталёт.

— У нас доўга не было дажджоў, — дзеліцца галоўны ляснічы. — 8 чэрвеня ўвялі забарону на наведванне лясоў, і адразу пачалі паступаць скаргі ад насельніцтва. Маўляў, многія спецыяльна бралі адпачынак для таго, каб нарыхтаваць ягад, зарабіць якую капейчыну. 12 ліпеня прайшоў дождж, і забарону знялі. І вось што атрымалася...

Пажар пазначыў сваю прысутнасць чорнымі плямамі на зямлі і абгарэлымі стваламі дрэў. Каб ягады тут зноў з'явіліся, павінен прайсці не адзін год.

— Паўтарылася сітуацыя 1992 года, — узгадвае Віктар Дамарад. — І тады, і сёння віной пажару стаў так званы чалавечы фактар. А тут яшчэ гарачае надвор'е, адсутнасць вільгаці...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З кожным крокам рухацца становіцца ўсё складаней. Гусенічны трактар прабіваў прасеку, уздоўж якой цягнецца пажарны рукаў, каб адасобіць незакрануты лясны масіў і даць магчымасць прабрацца да ачагоў. Больш-менш камфортна ісці можна толькі ў ботах ці ў берцах. Праз кожныя сто метраў сустракаюцца работнікі лясных гаспадарак з распыльнікамі ў руках. Стомленыя, яны з самага ранку тушаць ачагі полымя, каб тыя зноў не ўзнікалі. А там, дзе ачагі вялікія, іх заліваюць проста з рукава. На тушэнні пажару шчыруюць не толькі мясцовыя ляснічыя, але з Бабруйскага, Глускага, Быхаўскага і Клічаўскага раёнаў. Галоўнае тут — трымаць лінію, не даць агню распаўсюдзіцца. У самы эпіцэнтр ніхто не лезе. Там працуе выключна верталёт, які палівае ў цяжкадаступных месцах вадой, якую набірае ў коўш непадалёк у Свіслачы.

У гадзіны тры многія сваімі камандамі хаваюцца ў цяньку на перакус. Стол, зразумела, не як у сталоўцы, але падсілкаваць можна сытна. На разгорнутай газеце ў хлопцаў хлеб, памідоры, агуркі, кансервы, каўбаса, нават вафлі. Але галоўнае багацце тут, напэўна, вада, без якой у 30-градусную спёку доўга не папрацуеш. Тым больш калі ты на нагах з самага ранку.

Нягледзячы на тое, што пажар лакалізаваны, працы на некаторых участках гэтай мясцовасці яшчэ шмат. Усё ж такі патушыць торф няпроста. Цалкам знішчыць пажар у гэтых балоцістых мясцінах могуць толькі дажджы. Аднак, паводле прагнозаў сіноптыкаў, на гэтым тыдні іх не будзе.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*
Асіповіцкі раён

У ТЭМУ

Юрый МЯТЛІЦКІ, начальнік упраўлення аварыйна-выратавальных службаў і ліквідацыі надзвычайных сітуацый МНС:

— Цяпер усталявалася гарачае надвор'е, у лясах павышаны клас небяспекі. Дажджоў мала, засуха, глеба амаль абязводжаная. І любое ўздзеянне высокай тэмпературы на такую зямлю выклікае пажары, і нават пры невялічкім ветрыку — распаўсюджванне агню. Калі своечасова не лакалізаваць, пажар можа разысціся на вялікія плошчы. У многіх раёнах уведзена забарона на наведванне лясоў. І таму там нельга не толькі карыстацца адкрытым агнём, а наогул знаходзіцца.

МЕГАПОЛІС ПАМЕРАМ З КРАІНУ

У Кітаі з'явіцца горад з насельніцтвам 130 мільёнаў чалавек

Гэты неверагодны па памерах мегаполіс будзе створаны шляхам злучэння Пекіна з дзвюма суседнімі правінцыямі. Горад, насельніцтва якога будзе параўнальна, напрыклад, з колькасцю жыхароў такой краіны, як Расія, ужо будуецца.

МАШТАБНЫ ПЕРАЕЗД

...Станцыя метро Haojiafu, усяго ў гадзіне язды ад Пекіна пакуль блішчыць крыштальнай чысцінёй. На светла-шэрай платформе, выкладзенай новенькай пліткай, рэдка можна ўбачыць пасажыра. Гэтая станцыя пакуль вядзе ў нікуды. Вакол палеткі і пасвяцца статкі. Толькі шасціпалосная шаша, што перасякае вясковую ідылію, ды бліскучы вестыбюль метро нагадваюць пра будучыню гэтых мясцін.

Урадавыя і адміністрацыйныя будынкі павінны пераехаць з цэнтра Пекіна сюды. Кітайскія ўлады плануюць перасяліць дзясяткі тысяч чыноўнікаў ва ўсходні раён гарадскога падначалення Тунчжоу. Міністэрствы, універсітэты, бальніцы таксама пераселяцца ў гэтую, пакуль сельскую, мясцовасць. Як паведаміў член Палітбюро Камуністычнай партыі Кітая Го Цзіньлун, пераезд пачнецца ў 2017-м.

Шмат гадоў урад Кітая спрабаваў зменшыць памеры сталіцы, якая імкліва разрасталася. Зараз жа прапанаваны новы план, у адпаведнасці з якім Пекін стане цэнтрам новага велізарнага аб'яднанага горада. Гэта павінна дапамагчы разгрузіць цэнтр мегаполіса, спыніць негатыўны ўплыў на яго гістарычную частку і палепшыць экалагічнае становішча. Але, што не менш важна, стварэнне такога гіганта прастымулюе далейшую ўрбанізацыю Кітая. Гэты праект — частка плана Старшыні КНР Сі Цзіньпіна па развіцці рэгіёна, які атрымаў назву «Цзін-Цзінь-Цзі». Першы іерогліф абазначае «сталіца», другі ўзяты ад назвы горад Цяньцзінь, трэці — старая назва правінцыі Хэбэй. Мэта праекта — пазбегнуць хаатычнага развіцця шляхам усталявання дакладна скаардынаваных гарадскіх зон і калідораў. Нешта падобнае ўрад хоча бачыць і ў іншых частках краіны.

Сетка хуткасных цягнікоў павінна звязаць розныя часткі горада, і час падарожжа ад аднаго да другога субцэнтра складзе не больш за адну гадзіну. Зараз жа многім даводзіцца дабірацца на працу са спальных прыгарадаў у цэнтр Пекіна па пяць гадзін і больш.

Цягам некалькіх дзесяцігоддзяў пераносу кабінетаў чыноўнікаў з Пекіна быў табуяванай тэмай. У 1950-я гады архітэктар і ўрбаніст Лян Сычэн прапанаваў пабудаваць адміністрацыйны цэнтр па-за межамі сталіцы. Тады ідэя не спадабалася Мао Цзэдуну, які назваў яе контррэвалюцыйнай. Наадварот, дзяржаўныя міністэрствы і муніцыпальную адміністрацыю размясцілі ў старой частцы горада — у палацах і парках. Аднак з часам гэта нанесла адчувальную шкоду гістарычным будынкам. План па пераносе існуе ўжо шмат гадоў, але толькі Сі Цзіньпін змог прымусіць чыноўнікаў усё ж пачаць гэты працэс.

ІНДЭКС НЕРУХОМАСЦІ

Кожнай частцы новага мегагорада нададуць вызначаную функцыю. Пекін застанецца яго сэрцам. Ён будзе адказны за навуку і культуру. Горад-порт Цяньцзінь, дзе цяпер размешчаны асноўныя высокатэхналагічныя вытворчасці, што працуюць на экспарт, будзе займацца тэхналагічнымі даследаваннямі. Роля Хэбэя пакуль не вызначана, але, верагодна, там будуць размяшчацца невялікія вытворчасці і асноўныя жылыя кварталы. Галоўная мэта стварэння «Цзін-Цзінь-Цзі» — скараціць колькасць вытворчасцей, якія дамінуюць у Пекіне і іншых буйных гарадскіх цэнтрах. Сетка хуткасных цягнікоў павінна звязаць розныя часткі горада, і час падарожжа ад аднаго да другога субцэнтра складзе не больш за адну гадзіну. Зараз жа многім даводзіцца дабірацца на працу са спальных прыгарадаў у цэнтр Пекіна па пяць гадзін і больш.

Як будзе надалей развівацца гэты маштабны праект, пакуль сказаць складана. Але кітайскія эканамісты вельмі аптымістычныя ў ацэнках і прагназуюць, што новы мегаполіс будзе квітнець. Адно можна сказаць дакладна ўжо цяпер — усё гэта прывядзе да залатой ліхаманкі нерухомасці ў вызначаных трох рэгіёнах. Ужо цяпер цэны на нерухомасць у Цяньцзіні пайшлі ў рост...

У ДЭЛЬЦЕ ЖАМЧУЖНАЙ

У Паднябеснай самая вялікая колькасць насельніцтва сярод усіх краін свету, і, натуральна, тут найбольш гарадоў-мільённікаў. Вядома, у самай шматнаселенай краіне планеты павінен быць і самы вялікі на планеце населены пункт. Цяпер самым-самым горадам свету лічыцца агламерацыя ў дэльце ракі Чжуцзян (Жамчужная), якая ўпадае ў Паўднёва-Кітайскае мора ў раёне Гуанчжоу. Яна складаецца з 9 гарадоў-мільянераў і некалькіх дзясяткаў меншых гарадоў. Колькасць жыхароў горада, які так і завуць — Дэльта ракі Жамчужная (ДРЖ), ужо цяпер складае 42 мільёны чалавек і перавышае насельніцтва такіх краін, як Аргенціна (41 млн), Канада (35 млн) ці Аўстралія (23 млн). Гэтая велізарная колькасць людзей жыве на тэрыторыі плошчай каля 7 тыс. кв. км. Для параўнання: плошча Масквы складае 2,5 тысячы кв. км.

Да 2030 года, спадзяюцца ва ўрадзе Кітая, насельніцтва ДРЖ павялічыцца ўдвая і складзе прыкладна 80 млн чалавек. Дэльта ракі Жамчужная ўзнікла як адзіны сельскагаспадарчы раён у сярэдзіне мінулага стагоддзя. Паступовая ўрбанізацыя пачалася ў першай палове дзевяностых гадоў, калі ў дэльту пачалі перабірацца буйныя кампаніі і прадпрыемствы з многімі тысячамі працоўных. З 2003 года пачалося хуткае ператварэнне агламерацыі ў велізарны мегагорад.

Шанхай — адна з перспектыўных пляцовак для рэалізацыі мегапраектаў.

Цэны на нерухомасць ужо пайшлі ў рост.

У пустыні Гобі ўзвядуць самую вялікую ў свеце сонечную электрастанцыю.

ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ Ў ПУСТЫНІ ГОБІ

Глабальны падыход у Паднябеснай прымяняецца не толькі ў дачыненні да ўласна ўрбанізацыі. Напрыклад, у Пекіне абвясцілі пра пачатак будаўніцтва самай вялікай на планеце сонечнай электрастанцыі. Будоўля разгарнулася на тэрыторыі плошчай 25,5 кв. км у пустыні Гобі, правінцыя Цынхай, што непадалёк ад горада Голмуд. Праектная магутнасць электрастанцыі — 200 МВт. Гэта будзе не толькі самая вялікая сонечная электрастанцыя планеты, але і першая буйная электрастанцыя ў Кітаі, што не належыць дзяржаве. Будаўніцтва вядзе прыватная энергетычная кампанія Qinghai Solar-Thermal Power Group. Сонечная электрастанцыя ў Цынхаі будзе вежавага тыпу. У яе цэнтры будзе знаходзіцца высокая вежа вышынёй 20-30 метраў з рэзервуарам з вадой на вяршыні. Ён будзе выфарбаваны ў чорны колер для паглынання сонечных прамянёў.

Помпавая станцыя ў вежы будзе дастаўляць пару на турбагенератар. На некаторай адлегласці ад вежы размесцяцца геліястаты, люстэркі плошчай некалькі квадратных метраў. Адлюстраваныя ад іх сонечныя прамяні трапяць на ваду, якая будзе награвацца. Дарэчы, электрастанцыя такой жа магутнасці, што працуе на вугалі, будзе спальваць 4,26 млн тон вугалю ў год. Пры яго згаранні ўтвараецца каля 900 тысяч тон двухвокісу вугляроду і 8080 тон двухвокісу серы.

Дарэчы, Кітай, які апошнія гады жорстка крытыкуюць за забруджванне атмасферы планеты, прыкладае сур'ёзныя намаганні па абароне навакольнага асяроддзя. Дастаткова сказаць, што ў параўнанні з 2005 годам аб'ём экалагічна чыстай сонечнай энергіі, што выпрацоўваецца ў КНР, летась вырас больш чым у 400 разоў — да 28 ГВт. У планах давесці гэтую лічбу да 2020 года да 100 ГВт.

ШАНХАЙ З ПРЫСТАЎКАЙ «МЕГА»

У лістападзе мінулага года ўплывовая Камісія па рэформах і развіцці ўхваліла план па рэалізацыі ў Кітаі 21 вельмі буйнога праекта з агульным каштарысам у 115 млрд долараў. У яго ўваходзіць будаўніцтва высакахуткасных чыгунак, ультрасучасных і вельмі вялікіх аэрапортаў і многае іншае.

Прапанаваны новы план, у адпаведнасці з ім Пекін стане цэнтрам новага велізарнага аб'яднанага горада. Гэта павінна дапамагчы разгрузіць цэнтр мегаполіса, спыніць негатыўны ўплыў на яго гістарычную частку і палепшыць экалагічнае становішча. Але, што не менш важна, стварэнне такога гіганта прастымулюе далейшую ўрбанізацыю Кітая.

Адной з найбольш перспектыўных пляцовак, дзе ажыццяўляюцца шматлікія мегапраекты, стаў Шанхай. Камерцыйная сталіца Паднябеснай, мегаполіс з 25-мільённым насельніцтвам, у якім вельмі многае мае прыстаўку «мега»: аэрапорты і вакзалы, метро, водаправод, энергетыка і г.д. Цяпер тут узвялі суперхмарачос Шанхай Таўэр, кошт якога складае 2,4 млрд долараў. Па сваёй вышыні (632 метры) гэта адзін з самых высокіх будынкаў планеты.

На ўсход ад суперхмарачоса поўным ходам ідзе будаўніцтва гіганцкага Шанхайскага дыснейлэнда. Гэты велізарны парк забаваў агульнай плошчай без малога квадратны кіламетр павінен быць здадзены ў наступным годзе.

Падрыхтаваў Захар БУРАК.
litvinov@zviazda.by

НЕ ЎСЁ ДОБРАЕ ДОБРА

У 60-я гады мінулага стагоддзя працаваў я ў адным з нашых навукова-даследчых інстытутаў, не начальнікам, на жаль, а, хутчэй, наадварот — «старшым куды пашлюць». У той раз — а было гэта дзён за дзесяць да першамайскіх свят — мой начальнік сказаў:

— Тэрміновая камандзіроўка ў Маскву, на тыдзень... Паедзеце ўдваіх з Валодзем.

Загады начальства, як вядома, не абмяркоўваюцца: у Маскву — дык у Маскву, на тыдзень — дык на тыдзень.

У той жа вечар мы з Валодзем селі ў цягнік, каб раніцай быць на месцы. Мой калега, на шчасце, меў знаёмых у горадзе... Да іх, у інтэрнат, мы і падсяліліся, бо атэль у Маскве быў недасяжнай марай...

А далей пачаліся будні: у першай палове дня мы выконвалі даручэнні дырэкцыі інстытута, у другой — гулялі па горадзе, хадзілі па крамах. У Маскве тады шмат дэфіцыту было. А ўжо розных спакус... У дзень прыезду мы за 2 капейкі купілі газету «Вечерняя Москва» і ўбачылі там абвестку, што ў чацвер на Краснай плошчы адбудзецца рэпетыцыя парада фізкультурнікаў.

Вядома ж, нам хацелася б пабачыць сам парад, але 1 мая мы ўжо будзем у Мінску... Значыць, трэба, падумалі, хоць на рэпетыцыю трапіць.

І вось у той чацвер, надвячоркам, падыходзім да плошчы з боку Аляксандраўскага саду. Спыняемся, бо далей дарогу перакрывае металічная агароджа і кардон міліцыі — некага яна прапускае, некага не. А ззаду ж напірае натоўп... Страшная, скажу вам, сіла!

Нейкім чынам яна разлучае нас, «нясе» Валодзю на славутую плошчу, а вось мяне, на жаль, некуды ўбок, і я потым, як ні кружляю, трапіць туды не магу.

Шкадую страшэнна, бо там грыміць музыка, там, сённяшняй мовай кажучы, тусуецца моладзь, а я, што называецца, у пралёце...

Што тут будзеш рабіць: пахадзіў па горадзе, павароніў ды вярнуўся ў інтэрнат.

Валодзю чакаў з нецярпеннем і досыць доўга.

Гадзін у 11 вечара ён з'явіўся.

— Ну як рэпетыцыя, — спытаў я, — табе спадабалася? Цікава было?

— Ат, — толькі махнуў рукою калега.

А далей высветлілася, што ніякіх гледачоў за тым міліцэйскім кардонам не было: толькі фізкультурнікі. Таму Валодзя адразу ж пачаў прасіцца назад, пачаў тлумачыць, што ён ніякі не спартсмен, а тым больш не ўдзельнік парада.

Можна падумаць, што яго нехта слухаў... Не! Міліцыя не ўсіх на плошчу пускала, а з яе і наогул не выпускала нікога. Да таго ж хутка паступіла каманда ўсім пастроіцца, і Валодзю са словамі «У нас чалавека не хапае... Стань тут!» пацягнулі ў нейкую шарэнгу.

Ён, бедны, стаў, узяў у рукі сцяжкі і з імі, пад музыку гадзіны дзве маршыраваў па плошчы...

Пасля гэтага расповеду я доўга смяяўся і доўга яшчэ радаваўся, што на рэпетыцыю парада не трапіў. Бо яно ж, згадзіцеся, не ўсё добрае добра. І не ўсё дрэннае дрэнна.

П.І. Браток,
г. Мінск.

І ДА БУЛАВЫ ТРЭБА ГАЛАВЫ

Гэтую гісторыю мне расказаў мой калега. Цікавы ён быў тым, што кожны год вырошчваў індыкоў. Казаў, што гэта выгадная справа, бо мяса ў іх вельмі смачнае, карыснае, да таго ж дарагое...

А ўсё, на мой погляд, таму, што гадаваць гэтую птушку не ўсякі зможа: дужа далікатная — асабліва малая.

Іванавіч, праўда, быў спецыялістам (мы з ім ветэрынары), а потым з гадамі назапашваўся досвед... Так што ўсё ў яго атрымлівалася. Праўда, не заўжды.

У прыватнасці, у той злашчасны дзень яны з жонкай спакойна пайшлі на працу, а калі вярнуліся дамоў, ледзьве не памлелі: усіх індычанят — і ўжо ладных, падгадаваных — перадушыў суседскі Жулік. Сабака ў поўным сэнсе гэтага слова! Сарваўся з прывязі, нейкім чынам залез у двор...

Гаспадыня, убачыўшы гэта, схапілася за сэрца, гаспадар пайшоў да суседа высвятляць адносіны (гэта раней яны па-людску жылі: дапамагалі адзін аднаму, яшчэ і па чарцы бралі, а зараз...).

Галоўнае — абодва разумелі: гэта недарэчнасць, выпадак, вінаваты сабака. А з іншага боку, страта якая! І крыўда...

Пра гэта яны пагаварылі на двары ў суседа, потым той сусед (уладальнік сабакі і, дарэчы, добры паляўнічы) з пляшкай прыйшоў да «індыкавода».

З гора выпілі — кшталту міравой (і адной бутэлькай не абмежаваліся), зноў пагаварылі аб набалелым. Гэта значыць, аб тым, колькі працы і часу ўкладзена ў тых індыкоў, якім не лёс быў вырасці...

І да чаго дагаварыліся (ці дапіліся)? Да таго, што сабаку трэба... застрэліць, бо ён, па-першае, на гэтым не спыніцца — будзе душыць і іншых птушак, а па-другое, стары ён ужо, трэба разумець, здурнеў, калі за такое ўзяўся... Ды і, наогул, ад яго аніякай карысці...

Мужыкі сказалі — мужыкі зрабілі. Гэта значыць, узялі стрэльбы і вялікі «кубінскі» мех (раней былі такія), пасадзілі ў яго сабаку, занеслі ў лес...

Стралялі абодва.

Потым мех той закідалі ламаччам, прыйшлі дамоў і палеглі спаць.

...Прачыналіся назаўтра цяжка. Абодвум балелі галовы, абодвум было сорамна за сябе і шкада сабаку. Але... Што зроблена, тое зроблена і назад не адкруціш.

А зрэшты...

Нейкага дня — яны абодва дома былі — даносіцца з вуліцы шум: жанчыны войкаюць, божкаюць, дзеці пішчаць... З чаго б гэта? Высунуліся паглядзець і ў абодвух вочы на лоб: «мех» на вуліцы — не тое сунецца, не тое коціцца... А галоўнае — той самы, «кубінскі»!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У мужыкоў дзе толькі спрыт узяўся — куляй падляцелі да мяшка, дрыжачымі рукамі развязвалі тасёмку, а ўжо як потым абдымаліся з сабакам — жанкі зайздросцілі!

...Вось такая была гісторыя. І скончыць яе можна тым, што Жулік, нягледзячы на старасць і перанесены стрэс, жыў пасля яшчэ доўга. А можа, і цяпер жыве? Гэтага я не ведаю.

Соф'я КУРЦІН,
г.п. Лыптуны, Пастаўскі раён.

ДЗЕДАВА НАВУКА

Наднёманская вёска Купіск у далёкія 30-я гады мінулага стагоддзя, за польскім часам, як той казаў, складалася з трох частак: Вялікі (Велькі) Купіск і Любецкі — хаты ў два рады, а паміж імі і ў адзін — Паргавічы, або Казённае сяло, дзе пасяліліся манастырскія ў мінулым сяляне з Лаўрышава.

Дамоў усіх разам было больш за 200. Людзі жылі розных веравызнанняў (хаваліся на трох могілках), а пры жыцці на чужых і сваіх не дзяліліся: адно аднаму спагадалі, адно аднаму дапамагалі. Жылі не сказаць каб багата, не сказаць каб бедна: валодалі ў сярэднім трыма гектарамі ворнай зямлі, крыху болей мелі сенакосу на ўскрайку Налібоцкай пушчы.

Зрэшты, збожжа ды жывёла былі тады не ў цане, а вось усё крамнае каштавала вельмі дорага.

Купіскіх жыхароў кармілі ў асноўным пушча і Нёман. Зімой мужчыны ездзілі ў «таварнікі» — звозілі лес на рум, каб вясной плытнікі з Мікалаеўшчыны і Сіняўскай Слабады вязалі плыты. Цікава было чуць, як яны крычалі: «Закідай шырыгу! Дзяржы набарбару!» А далей разводзіўся плывучы мост і плыты ішлі па цячэнні...

Акрамя гэтага заробку, амаль кожны гаспадар у вёсцы быў здольны да якой-небудзь справы: былі свае бондары, свае цесляры і сталяры, свае кавалі. Мой бацька, напрыклад, вельмі прыгожа крыў дахі саломай, для кавалёў рабіў з дрэва вугаль. Хтосьці меў конную малатарню — дапамагаў сялянам абмалочваць збожжа...

Але ж распавесці мне хочацца пра зусім адметнага дзеда — Амяльяна Чэрніка. Ён, па-першае, быў вельмі добры каваль: выраблял адмысловыя плугі, сярпы ды іншы сялянскі рыштунак. Ён жа меў сваю крамку, дзе прадавалася ўся патрэбная драбяза: іголкі, запалкі, пернікі, піва, цукеркі... Дарэчы, па гэтыя тавары крамнік ездзіў за 30 вёрст у Навагрудак. І тады яго вяртання чакалі ўсе дзеці з акругі, бо дзед быў чалавекам шчодрым, добрым і па дарозе ўсіх частаваў. У выніку цукерак у краму прывозіў толькі палову...

Але ж у памяці не толькі гэта. Самым галоўным заняткам дзеда Амяльяна былі пчолы. І калі ён браўся выкачваць мёд... Божухна, якое свята пачыналася ў купіскай дзятвы! Малыя — кожны са сваім кубачкам, місачкай, хлебам — збягаліся з усёй вёскі!

Дзед ставіў вядро вады, наліваў у міскі духмянага мёду (крыху з вашчынай) і есці дазваляў «ад пуза» — колькі хочаш! Адзінае — заўжды і досыць строга папярэджваў: «Ешце, дзеткі, але ж правярайце, каб мёд не пацёк праз пупкі. Тады ўсё — кідайце, бо жывоцікі будуць балець!»

І вось ужо лета! І вось тое свята! Дзеці налятаюць на мёд! Ядуць, вадой запіваць і, вядома ж, памятаюць дзедава настаўленне — мацаюць пупкі праз сукеначкі ды кашулькі сваімі «салодкімі» ручкамі. Адзін раз памацаюць, другі... Адзежа, на жывоціках, як бачыш, брудная! Значыць што? Ну вядома ж — мёд пацёк!

...Часта цяпер чуюцца спрэчкі пра тое, колькі вады трэба піць, колькі мёду есці. Нехта кажа, што ў дзень не больш як сталовую лыжку, нехта — што дзве ці нават ад пуза.

А на мой погляд, не маюць рацыі ні першыя, ні другія, ні трэція. Мёд трэба есці (дзед Амяльян вучыў!), пакуль не пацячэ праз пуп. Так што пазірайце... Ці мацайце.

Надзея РАМАНЧЫК,
в. Падбор'е, Навагрудскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж... Розныя лісты ў нашай пошце, розныя і гісторыі. У прыватнасці, пры апошняй — ад спадарыні Надзеі Дзмітрыеўны Раманчык — кароткая прыпіска пра тое, што падабаецца газета, падабаецца рубрыка «Алё, народ на провадзе!» І далей (даслоўна): «Даўно мне карцела расказаць пра вёску Купіск, пра дзеда Амяльяна, карцела апісаць тое частаванне мёдам. Але не хапала то цярпення, то смеласці... Зараз вось дасылаю, можа, спатрэбіцца?»

Гэта, згадзіцеся, дзіўнае пытанне, бо расповед пра такую вёску і пра такога цікавага дзеда проста не можа не спатрэбіцца.

А таму ўсім, хто пакуль толькі чытае нашы «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі», у чарговы раз скажам сваё настойлівае: «Пішыце!» Не трэба адкладваць. А ўжо баяцца — і пагатоў!

Шчыры дзякуй! Загадзя.

■ Здарэнні

Начны ўгон тралейбуса

Каля дзвюх гадзін ночы ў Фрунзенскі РУУС сталіцы паступіла паведамленне, што на тэрыторыі тралейбуснага парка па вуліцы Харкаўскай невядомы ўгнаў тралейбус, на якім здзейсніў дарожна-транспартнае здарэнне.

Прыбыўшы на месца, супрацоўнікі аддзела ДАІ затрымалі падазраванага. 19-гадовы малады чалавек патлумачыў, што нядаўна стажыраваўся ў тралейбусным парку на пасадзе рабочага, таму трапіць у транспартны сродак і завесці яго не склала для яго вялікай цяжкасці. Аднак хлопцу ўдалося праехаць толькі 20 метраў, пасля чаго ён сутыкнуўся з яшчэ адным тралейбусам. У дачыненні да маладога чалавека заведзена крымінальная справа за ўгон.

Не таму яна вучылася...

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Заводскага РУУС сталіцы затрымалі 20-гадовую студэнтку, якая за пяць месяцаў гэтага года здзейсніла каля 15 крадзяжоў маёмасці.

Са студзеня па май маладая асоба ў жаночай прыбіральні выкрадала з сумачак студэнтак і выкладчыкаў таго ж універсітэта, дзе вучылася сама, кашалькі і грошы. Злачынкай, як устанавілі падчас вышуковых мерапрыемстваў, была ўраджэнка Гомельскай вобласці. Скрадзеныя рэчы і грошы яна выкарыстоўвала з асабістымі мэтамі. Заведзена крымінальная справа.

Другакласнік вылічыў п'янага таксіста

Дзякуючы дзіцяці супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі затрымалі кіроўцу нападпітку. Інцыдэнт адбыўся ў сталіцы на вуліцы Пуліхава.

— Другакласнік катаўся ў двары на веласіпедзе, і яго ўвагу прыцягнулі неадэкватныя паводзіны кіроўцы аўтамабіля таксі маркі «Нісан», якое ехала па тратуары. Дзіця расказала пра тое бацьку, які і пазваніў у міліцыю, — расказала «Звяздзе» **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.** — Тым часам кіроўца «Нісана» з'ехаў з тратуара на праезную частку, пры гэтым ледзьве не збіўшы пешаходаў, і прадоўжыў рух, віхляючы з боку ў бок. Урэшце аўтамабіль заскочыў на бардзюрны камень і спыніўся. Па словах відавочцаў, калі яны падышлі да машыны, кіроўца ўжо спаў, а на пярэднім сядзенні ляжала бутэлька ад гарэлкі ёмістасцю 0,7 літра.

Прыбыўшыя супрацоўнікі ДАІ разбудзілі і затрымалі 37-гадовага парушальніка. Візуальна было відаць, як ён добра заклаў «за каўнер». Аднак ад медыцынскага агляду мужчына адмовіўся. Кіроўца паводзіў сябе вельмі агрэсіўна: абражаў супрацоўнікаў, хапаўся за форменнае абмундзіраванне, лаяўся. Высветлілася, што мужчына не мае права кіравання транспартнымі сродкамі: пасведчанне кіроўцы яго пазбавіў суд тэрмінам на пяць гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Наркотык у футарале

Супрацоўнікі сталічнай міліцыі затрымалі чарговага аматара курыльных сумесяў.

Ім аказаўся 22-гадовы беспрацоўны мінчанін, які вырашыў пакурыць спайс каля... Палаца дзяцей і моладзі. Праваахоўнікі праявілі пільнасць і пры вобыску знайшлі ў хлопца футарал ад акуляраў, у якім хаваўся пакецік з карычневым рэчывам і трубка з фольгі для курэння. Сумесь ён набыў у адной з інтэрнэт-крам. У дачыненні да затрыманага ўжо заведзена крымінальная справа.

Тарас ШЧЫРЫ

■

У ШКОЛУ — ПА КАРТКАХ

«Карту навучэнца» плануецца ўкараніць ва ўсіх школах сталіцы ў 2016 годзе

Яна ўяўляе сабой бескантактны паўнавартасны плацежны сродак, з дапамогай якога дзіця можа разлічвацца за школьнае харчаванне. Апроч таго, «Карта навучэнца» дазваляе бацькам адсочваць, калі дзіця прыходзіць у школу і калі пакідае яе. А яшчэ пры яе дапамозе можна атрымліваць доступ да адукацыйных і сацыяльных электронных сэрвісаў.

Гэта сумесны праект Беларусбанка, Мінгарвыканкама, Нацыянальнай акадэміі навук і плацежнай сістэмы «БелКарт». Па ім у Мінску ўжо працуюць 12 установ агульнай сярэдняй адукацыі.

— З 1 верасня ў 12 школах, дзе ўкаранёны пілотны праект «Карта навучэнца», сумесна з камітэтам па адукацыі і камбінатамі школьнага харчавання мы запускаем безнаяўную аплату харчавання, — расказала **намеснік старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Таццяна МІХАЙЛОЎСКАЯ**.

Банк эмітаваў звыш 9,5 тысячы плацежных карт і раздаў іх бясплатна ўдзельнікам праекта. Праведзенае банкам апытанне паказала, што бацькі і дзеці зацікаўлены ў ім і ацэньваюць праект станоўча.

Апроч пералічаных функцый, існуе тэхналагічная гатоўнасць запісу на «Карту навучэнца» транспартнай праграмы для яе выкарыстання ва ўліку электроннай сістэмы аплаты праезду ў Мінску. Такім чынам, адзначаюць распрацоўшчыкі, карта дапаможа адсачыць патокі дзяцей і зразумець, ці правільна датуецца з гарадскога бюджэту бясплатны праезд школьнікаў.

Да 1 студзеня 2016 года плануецца адаптаваць да выкарыстання «Карты навучэнца» тыя школы, якія цяпер абсталяваны прапускной сістэмай. А на працягу наступнага года мяркуецца ўкараніць праект ва ўсіх сталічных школах.

Дзіяна СЕРАДЗЮК. *seradzyuk@zviazda.by*

ЛАВІЛІ КАРПАЎ ЦЭНТНЕРАМІ

Сапраўдная пагоня, выкарыстанне спецсродкаў і наручнікі на запясцях — так скончылася незаконная рыбалка для двух жыхароў Пастаўскага раёна.

Браканьеры трапілі ў поле зроку супрацоўнікаў Глыбоцкай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету каля 4 гадзін раніцы, падчас правядзення рэйду. На тэрыторыі Пастаўскага раёна, непадалёк ад сажалак рыбгаса «Навінкі», інспектары запрыкмецілі «Ніву», якая заехала на тэрыторыю нежылой вёскі. Калі ж гэтую машыну праз пэўны час паспрабавалі спыніць, вадзіцель не выканаў законных патрабаванняў інспектараў і націснуў на газ. Як паведаміў начальнік міжраінспекцыі Аляксей Протас, дагнаць і блакіраваць «ВАЗ» двума службовымі аўтамабілямі атрымалася толькі праз некалькі кіламетраў непадалёк ад вёскі Палялейкі Шаркаўшчынскага раёна. Але нават пасля гэтага парушальнікі паспрабавалі ўцячы, а калі іх дагналі, аказалі супраціўленне. Інспектары былі вымушаны выкарыстаць спецсродкі: слязісты газ і наручнікі. Як высветлілася, затрыманым было што хаваць — здабычай браканьераў сталі 95 асобін карпа агульнай вагой 103 кілаграмы, якіх паймалі лёсачнымі сеткамі. У дачыненні да парушальнікаў складзена адразу некалькі адміністрацыйных пратаколаў, акрамя таго, матэрыялы накіраваны ў праваахоўныя органы для дачы прававой ацэнкі.

Сяргей АЛЯКСАНДРАЎ.

ПАСЛАННЕ Ў ГІЛЬЗЕ

У Гродне аднавілі фрагменты тэксту салдацкай запіскі часоў Першай сусветнай вайны

Яе знайшлі на мяжы Смаргонскага і Маладзечанскага раёнаў. Пасланне знаходзілася ў гільзе, аднак нешта прачытаць было немагчыма: чарніла выцвіла. Знаходку перадалі экспертам-крыміналістам, якія з дапамогай сучаснага абсталявання аднавілі тэкст.

— Шляхам прымянення спецыяльных крыміналістычных метадаў і правядзення тэхніка-крыміналістычнага даследавання дакументаў былі прачытаны асобныя фрагменты запісаў, — каментуе **намеснік начальніка ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Гродзенскай вобласці Дзмітрый ГРЫНЕВІЧ**. — Яны маюць ваенную тэматыку. На трох кавалках паперы захаваліся асобныя словы — мы прачыталі «полк», «узвод», а таксама фрагменты воінскіх званняў. З улікам лексікона і літар можна зрабіць выснову, што запіс зроблены на рускай мове дарэформеннага перыяду. Мяркуем, што дакумент адносіцца да часоў Першай сусветнай вайны.

Хоць прозвішча невядомага салдата нідзе не значыцца, гісторыкі не выключаюць, што ён мог быць беларусам: слова «взвод» напісана з літары «у».

Дарэчы, менавіта ў Смаргонскім раёне, дзе была знойдзена запіска, у Першую сусветную вайну адбыліся самыя кровапралітныя баі.

Надзея ПАЎЛАВА.

АТРУТНЫЯ ПІСЬМЫ НЕ ЗНАЙШЛІ АДРАСАТАЎ

За апошні час службовыя асобы Мінскай рэгіянальнай мытні завялі дзве крымінальныя справы па фактах незаконнага перасоўвання праз мытную граніцу наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў аульнай вагой больш за паўкілаграма.

— У першым выпадку жыхар адной з афрыканскіх краін паспрабаваў пераслаць у Беларусь больш за 16 грамаў марыхуаны. Пры аглядзе міжнароднага паштовага адпраўлення быў знойдзены спецыяльны пакет на зіп-зашчапцы, дзе знаходзілася раслінная маса цёмна-зялёнага колеру. У дэкларацыі ж было ўказана, што ў адпраўленні — адзенне, якое накіроўвалася на адрас замежнага грамадзяніна, што жыве і вучыцца ў адным з ВНУ, — расказала **старшы інспектар аддзела ідэалагічнай работы Мінскай рэгіянальнай мытні Таццяна ПРАСАЛОВІЧ**.

У другім выпадку міжнароднае паштовае адпраўленне, задэкларованае як «электронная прылада», таксама прызначалася для жыхара сталіцы і прыйшло з Кітая. У ім быў знойдзены пакет з цвёрдымі крышталічнымі кавалкамі празрыста-белага колеру. Экспертыза засведчыла, што «прылада» вагой больш за паўкілаграма змяшчае ў сваім саставе асабліва небяспечнае псіхатропнае рэчыва.

ДАРЭЧЫ

За паўгода службовымі асобамі Мінскай рэгіянальнай мытні выяўлена 16 спроб незаконнага перасоўвання праз мытную мяжу наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, заведзена 9 крымінальных спраў, з незаконнага абарачэння канфіскавана больш за 1,3 кілаграма гэтых згубных ядаў.

Сяргей РАСОЛЬКА. rs@zviazda.by

Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация»

оказывает услуги по:

► **ОЦЕНКЕ ИМУЩЕСТВА (недвижимость, транспорт, оборудование)**
► **ОРГАНИЗАЦИИ И ПРОВЕДЕНИЮ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ**
► **ИНВЕНТАРИЗАЦИИ И ОЦЕНКЕ ЗЕЛЕНЫХ НАСАЖДЕНИЙ**

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:

07 сентября 2015 г. в 11.00 состоится **ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН** по продаже недвижимого имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Белшина», в составе:

Лот № 1 (предмет торгов): изолированное помещение с инвентарным номером 730/D-7335 (помещение для торговли обувью), общей площадью 84,9 кв.м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая,10А

Организатор торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д.4, к.222, (р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369, ОКПО 55484006)
Продавец предмета торгов	Открытое акционерное общество «Белшина», УНП 700016217, Минское шоссе, 213824, г. Бобруйск, Могилевская область
Место проведения торгов и подачи документов	г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация»
Начальная цена продажи, рублей без НДС	300 124 500 рублей без учета НДС, задаток 10% от начальной цены продажи – 30 012 450 рублей
Номер расчетного счета для перечисления задатка	Получатель платежа – ОАО «Белшина», р/с 3012000003446 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700016217, ОКПО147621337000
Информация о земельном участке	Земельный участок с кадастровым номером 724050100001005437 расположен по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая, 10а, площадь – 0,0161 га, предоставлен для обслуживания предмета торгов. Имущественные права на земельный участок – право аренды, правообладатель – ОАО «Белшина».
Характеристика предмета торгов	
Помещение для торговли находится в одноэтажном кирпичном здании,1985 г. п., фундамент – кирпич, перекрытие – ж/б, кровля – асбестоцементные волнистые листы, полы – бетон, имеется элетроснабжение	
Условия продажи	При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20%
Срок заключения договора купли-продажи	в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Условия оплаты	определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи
Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка	По 02 сентября 2015 г. включительно до 16-00

Для участия в торгах лица, заявившие о своем участии в них, должны предоставить по указанному адресу следующие документы: заявление на участие в торгах; копию платежного поручения о внесении участником торгов суммы задатка с отметкой банка об исполнении, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь:** *юр. лицам* – доверенность представителю юр.лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; *представителям физ. лиц* – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь:** *юр. лицам* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в торгах) или иное эквивалентное доказательство юр.статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; *юр. лицам и физ. лицам* – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорус. (рус.) язык; представителям юр. лиц и физ. лиц – легализованную в установленном порядке доверенность.

Порядок проведения торгов: Шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Задаток, внесенный Победителем торгов, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 5(пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты их проведения.

Победитель (претендент на покупку) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемого Организатором торгов.

Получить доп. информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или, связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до17.00.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ **17 августа 2015 года** ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Реммех»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)				
№	**Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов**	**Местонахождение предмета торгов**	**Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб.**	**Размер задатка, бел. руб.**
1.	Административное помещение общей площадью 289,3 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145924 (назначение: административное помещение) 1-й этаж 4-этажного здания	г. Минск, ул. Бабушкина, 48-2	2 530 908 374	250 000 000
2.	Административное помещение общей площадью 402,8 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145928 (назначение: административное помещение) 3-й этаж 4-этажного здания	г. Минск, ул. Бабушкина, 48-6	3 536 861 890	350 000 000
3.	Административное помещение общей площадью 408,9 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145929 (назначение: административное помещение) 4-й этаж 4-этажного здания	г. Минск, ул. Бабушкина, 48-7	3 570 328 238	355 000 000

Наличие обременений: залог, аренда.

Продавец имущества: ОАО «Реммех», ул. Бабушкина, 48, 220024, г. Минск.

Организатор торгов: УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Реммех», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 15 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся 17 августа 2015 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 06.08.2015 по 13.08.2015 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону: (017)291-83-56, (029)697-93-09.

ТЕЛЕФОНЫ ДЛЯ СПРАВОК:

(017) 327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);

(017) 296-35-94, (017) 291-83-56, (029) 697-93-09 (ОАО «Реммех»).

Хрысціне засталося сядзець крыху больш за год. Дзяўчына хоча хутчэй вярнуцца да сваёй працы — танцаў.

«Як тут апынулася? Сужыцель давёў... Ён «афганец» кантужаны, выпіць любіў. Буйны быў. Вось неяк і не вытрымала, пабіла яго, калі ў чарговы раз стаў чапляцца». Гэтую гісторыю нам расказала асуджаная Ірына. Нястрыманасць ёй дорага абышлася: за нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў жанчына на некалькі гадоў трапіла ў гомельскую папраўчую калонію №4. Цяпер разумее, што фізічнай сілай праблему ўсё роўна не вырашыла б. З'язджаць трэба было ад такога каханка, але ж жаночае сэрца да апошняга спадзяецца на цудоўнае пераўтварэнне. Сёлета Ірыне пашанцавала: яна трапіла ў спісы амніставаных. Дадому вернецца на год раней. Кажа, што дзяўчаты на працы (Ірына была пакаёўкай у санаторыі) ужо чакаюць.

Пад дзеянне сёлетняй амністыі трапіла амаль сёмая частка зняволеных гомельскай жаночай калоніі — крыху больш за 200 чалавек. Каму дазваляюць выйсці на свабоду раней і як амніставаным дапамагаюць уладкавацца на працу і вярнуцца да нармальнага жыцця, даведваліся нашы карэспандэнты.

ШАНЦ ВЯРНУЦЦА ДАДОМУ

Пра лёсы амніставаных, адукацыю зняволеных і жыццё пасля калоніі

НА ПЕРАВЫХАВАННЕ — ЗА ШВЕЙНУЮ МАШЫНКУ

Мы сядзім у штабе калоніі. З другога паверха бачна, як жанчыны ў ружовых сукенках (уніформа мясцовых зняволеных) выстройваюцца ў роўныя шарэнгі. На абед збіраюцца. Тых, каго па амністыі цалкам вызвалілі (такіх прыкладна 50 чалавек), сярод іх ужо няма. Справы гэтых жанчын пастараліся разгледзець у першую чаргу.

На амністыю маглі разлічваць пенсіянеркі, мамы, чые дзеці яшчэ не дасягнулі 14-гадовага ўзросту, асуджаныя, злачынствы якіх не ўяўлялі з сябе вялікай грамадскай небяспекі. Напрыклад тыя, хто папаўся на нязначных крадзяжах, злоўжываў службовымі паўнамоцтвамі (браў хабар ці растрачваў грошы прадпрыемства). Аднак той факт, што зняволеная адносіцца да адной з названых катэгорый, яшчэ не гарантуе, што ёй скароцяць тэрмін.

— 30 жанчынам (прыкладна 13 працэнтам), якія падпадалі пад пералічаныя ўмовы, у амністыі было адмоўлена. З розных прычын. Хтосьці не кампенсаваў урон, нанесены злачынствам, іншыя злосна парушалі ўстаноўлены парадак, — тлумачыць **намеснік начальніка ўстановы па папраўчым працэсе Алег ЛІТВІНАЎ.**

Адзін з крытэрыяў ацэнкі выпраўлення — адносіны да працы. Жанчыны ў калоніі заняты на кухні, у пральні. Але большасць адпраўляюць на швейную вытворчасць: вырабляць рабочае адзенне і форму для прадстаўнікоў сілавых структур. Той, хто з машынкай зусім не ладзіць, вяжа мачалкі. Норма выпрацоўкі — не ніжэйшая за ўзровень брыгады. Заробкі ў асуджаных розныя. Колькі кожная напрацавала, столькі і атрымае. Дзяўчаты, якія перавыконваюць норму, у месяц і па шэсць мільёнаў маюць. Праўда, скарыстацца зароблемымі грашыма цалкам зняволеныя не могуць. З гэтай сумы, напрыклад, адразу адымаюцца затраты на ўтрыманне — каля мільёна ў месяц. У тых, хто павінен пакрываць урон ці пералічваць аліменты на дзяцей (такіх у калоніі каля тысячы), пасля ўсіх выплат на рахунку застаецца толькі дзесяць працэнтаў ад заробку. У іншых — не менш за чвэрць.

ВЫЗВАЛІЦЦА З НОВАЙ ПРАФЕСІЯЙ

Перш чым выпусціць амніставаных, адміністрацыя калоніі павінна ўпэўніцца, што жанчынам ёсць куды ісці, і, калі што, дапамагчы ім знайсці прытулак і працу на волі. За тры месяцы да вызвалення ў камітэты па працы і сацыяльнай абароне, на прадпрыемствы пачынаюць накіроўваць лісты аб бытавым уладкаванні. Асобныя арганізацыі ў сваю чаргу таксама пішуць у калонію: паведамляюць, што гатовы забяспечыць месцамі былых асуджаных. Уладкаваць удаецца амаль усіх. Летась з нявырашаным пытаннем засталіся толькі тры жанчыны — «зусім цяжкія выпадкі».

У кожнай вобласці працуе цэнтр адаптацыі для раней асуджаных. Там чалавеку дапамагаюць асвоіцца ў грамадстве. З праблемай вяртання ў асяродак, дзе быў да калоніі, вызваленыя сутыкаюцца часта. Той жа наркаман, калі зноў апынецца ў старой кампаніі, верагодна, ізноў «падсядзе» на іглу. А чалавеку, які адсядзеў за забойства, магчыма, не варта паказвацца ў горадзе ці вёсцы, дзе ўсё адбылося: касыя позіркі суседзяў і размовы за спінай наўрад ці будуць спрыяць паспяховай адаптацыі былога зняволенага. Таму ў калоніі пільна вывучаюць сітуацыю, у якой іх падапечныя апынуцца на волі.

— Трэба ўпэўніцца, што вызваленыя будуць у далейшым паводзіць сябе правапаслухмяна, і забяспечыць іх умовамі, якія паспрыяюць рэсацыялізацыі, — кажа Алег Літвінаў.

Перш чым выпусціць амніставаных, адміністрацыя калоніі павінна ўпэўніцца, што жанчынам ёсць куды ісці, і, калі што, дапамагчы ім знайсці прытулак і працу на волі.

Алег Міхайлавіч згадаў яшчэ пра пілотны праект, які збіраюцца запусціць на базе калоніі, але потым вырашыў не расказваць: каб не сурочыць. Праўда, крыху пазней **намеснік начальніка аддзела папраўчага працэсу Алена ДРАЗДОВА** ўсё ж такі выдала пару дэталяў: асуджаныя змогуць дыстанцыйна атрымліваць вышэйшую адукацыю. Сярод спецыяльнасцяў, якія прапануюць асвоіць, — юрыст, менеджар, бухгалтар. Раней у беларускіх месцах пазбаўлення волі такой магчымасці не было.

Акрамя гэтага, у калоніі рэалізуецца шэраг пастаянных сацыяльных праектаў. Напрыклад, тут адкрыты філіял Гомельскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа бытавога абслугоўвання, дзе жанчыны могуць вывучыцца на швачку-краўца ці паспрабаваць сябе ў спецыяльнасці «Цырульніцкае мастацтва і дэкаратыўная касметыка». Групы набіраюць невялікія: на швачку — 50 чалавек, на цырульніка — 25. Раней былі яшчэ курсы манікюру.

РАЗБОЙ І ХАБАР У ПЯЦЬ ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

На швейнай фабрыцы працоўны дзень у разгары. Адны жанчыны раскройваюць дэталі будучай формы, іншыя спрытна змацоўваюць іх на машынцы. Некаторыя з амніставаных, што заступілі на змену, згадзіліся з намі пагутарыць.

На пытанне «Чаму сюды трапіла?» маладая дзяўчына Насця адказвае коратка: «Па глупстве». Сімпатычная брунетка некалі працавала ў масажным салоне. Праўда, у спісе паслуг, што аказвалі ў тым цэнтры, значыўся не толькі масаж. Прыгожыя дзяўчаты практыкавалі ў салоне і іншыя, больш прыбытковыя, спосабы заробку. Насцю асудзілі за прадастаўленне памяшкання для заняткаў прастытуцыяй. Прысуд — 10 гадоў калоніі. Пасля апеляцый і дзвюх амністый (леташняй і сёлетняй) тэрмін скараціўся да шасці гадоў.

— Можа, пашанцуе, і пад наступную амністыю траплю. Мне тры гады сядзець засталося. Па доме сумую, — уздыхае Насця.

За другім сталом працуе Хрысціна. Усмешка, яркі макіяж... У родным Пінску яна была арганізатарам танцавальных шоу-праграм. У калоніі сферу дзейнасці давялося часова змяніць: тут дзяўчына камплектуе гатовыя вырабы па размерах і адпраўляе на фабрыку. Сядзіць за разбой. «Пазнаёміліся з сяброўкай з двума хлопцамі, згадзіліся схадзіць з імі на спатканне, — узгадвае той дзень Хрысціна. — Спачатку ўсё ішло нармальна, а потым кавалеры сталі рукі распускаць. Мы і патэлефанавалі сябрам, якія хутка прымчаліся і дапамаглі «разруліць»

Вярнуцца да звычайнага жыцця, што па той бок агароджы, марыць кожная.

Памілаванне ў дзеянні

Як паведамілі ва упраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі, закон «Аб амністыі ў сувязі з 70-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў» разгледжаны ў дачыненні да амаль 6 тысяч чалавек.

Начальнікі закрытых папраўчых устаноў вынеслі пастановы аб вызваленні 1389 пакараным, з якіх 25 — непаўналетнія. Вырашана скараціць тэрмін зняволення на год 1515 асуджаным. Пры гэтым падчас амністыі асуджаныя ўжо пакрылі шкоду амаль на 3,5 мільярда рублёў.

Тарас ШЧЫРЫ.

КАМЕНТАРЫЙ ДА ТЭМЫ

Алег ТОКУН, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:

— Для асоб, вызваленых з месцаў пазбаўлення волі, у краіне забраніравана больш за шэсць тысяч працоўных месцаў. Гэта вакансіі ва ўсіх сферах эканомікі: з калоній жа розныя спецыялісты выходзяць. За паўгода ў цэнтры занятасці звярнуліся 2,9 тысячы былых зняволеных. З іх 1116 чалавек мы працаўладкавалі, 108 накіравалі на атрыманне адукацыі. Каля 300 грамадзян адмовіліся ад прапанаваных вакансій. Асноўная праблема ўладкавання людзей, што выйшлі з месцаў пазбаўлення волі, — іх уласнае нежаданне працаваць. Прыкладна 50 працэнтаў такіх грамадзян мы здымаем з уліку ў службах занятасці за няяўку да нас на працягу перыяду, большага за тры месяцы. Вядома, і не кожны наймальнік гатовы прыняць на прадпрыемства такога работніка. Таму ў нас дзейнічае гэты механізм браніравання. Калі працадаўца, які заключыў з намі дагавор, адмовіцца забяспечыць месцам былога асуджанага, то павінен будзе сплаціць штраф — да 50 базавых велічынь.

У гомельскай калоніі адбываюць пакаранне каля 1,3 тысячы жанчын.

Больш фота на сайце zviazda.by

Сітуацыю. Пра крымінальную адказнасць у той момант не думалі». Амністыі, якая скараціла тэрмін на год, асуджаная вельмі рада. На свабоду дазволяць выйсці праз 13 месяцаў.

— Цяпер уся ў летуценнях, чаканнях, — шчасліва ўздыхае дзяўчына і прызнаецца, што марыць не толькі вярнуцца да любімага занятку — танцаў, але і знайсці добрага мужчыну. — Не дзяўчынка ўжо, кахання сур'ёзнага хочацца. І пра дзетак задумваюся.

Яшчэ адну амніставаную, Вольгу, выпусцяць наступнай вясной. Прычына, праз якую жанчына трапіла ў калонію, банальная — хабар. Спакусілася на пяць тысяч долараў — «удзячнасць ад кліента» — і не заўважыла, што яе запісвала камера відэаназірання. Незаконна атрыманыя грошы Вольга даўно вярнула. На свабоду жанчына рвецца не толькі з прычыны працы (як кваліфікаванага спецыяліста, яе гатовы прыняць на месца менеджара ў адну са сталічных кампаній). Дома асуджаную чакае хворая маці.

— Яна інвалід другой групы, ёй патрэбны догляд, — як толькі размова зайшла пра маці, вочы Вольгі сталі вільготнымі. — Добра, што муж з сынам дапамагаюць, клапоцяцца пра яе, пакуль мяне побач няма. Прабачце... *(жанчына дастае з кішэні сурвэтку і выцірае слёзы, якія ўжо не ўдаецца стрымаць)* балючая тэма.

У гомельскай калоніі знаходзяцца асуджаныя, якія ў месцах пазбаўлення волі апынуліся ўпершыню. На тое, што гэты тэрмін стане апошнім, спадзяюцца многія жанчыны. Магчымасці вярнуцца дадому раней Вольга ўдзячна:

— Амністыя — гэта акт гуманнасці. Розныя сітуацыі здараюцца, і дзяўчаты тут розныя. У многіх ёсць сем'і, якім яны патрэбны. Усе памыляюцца. І тым, хто асэнсаваў сваю памылку, варта даваць шанц.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by
Фота Надзеі БУЖАН.

■ Тэрыторыя мастацтва

КАМЕННЫ «ПАДАРУНАК» КАЛОЖСКАМУ ПАРКУ

У Гродне ствараецца музей скульптур пад адкрытым небам



У парку, што размешчаны побач з жамчужынай беларускага дойлідства XII стагоддзя, Свята-Барыса-Глебскай (Каложскай) царквой, нядаўна ўсталявалі дзевяць каменных скульптур.

І гэта, як спадзяецца **гродзенскі скульптар Уладзімір ПАНЦЯЛЕЕЎ,** толькі пачатак своеасаблівага музею пад адкрытым небам. Падобны ёсць у гарадскім парку ў Клайпедзе — сёння яго ўпрыгожваюць 116 скульптур, якія ствараліся літоўскімі майстрамі на працягу 15 гадоў.

Музейныя «экспанаты» для Каложскага парку летась падчас пленэру «Гродна. Мінулае і сучаснасць» стварылі скульптары Арцём Мядзведзеў, Іван Арцімовіч, Аляксей Сарокін, Ігар Засімовіч, Карней Аляксееў, Кацярына Зантарыя і Уладзімір Панцялееў. Матэрыялам для большасці гэтых работ паслужылі валуны з палёў Гродзеншчыны. Цяпер яны быццам атрымалі другое жыццё ў выявах Каложскай царквы, воіна-ліцвіна, рыцарскага шлема, старажытнаславянскага бажаства, Арфея і Эўрыдыкі... А яшчэ адна пленэрная работа (каменны медаль з выявай сімвала горада над Нёманам — аленя Святога Губерта — і надпісам «Культурная сталіца Беларусі 2014 года — Гродна») усталявана каля будынка другой паловы XVIII стагоддзя на плошчы Тызенгаўза, дзе да нядаўняга часу размяшчаўся Нацыянальны гістарычны архіў у Гродне.

Уладзімір Панцялееў спадзяецца, што ў горадзе над Нёманам будуць штогод праводзіцца пленэры, у тым ліку з удзелам скульптараў з суседніх краін, каб Каложскі парк папаўняўся новымі каменнымі «падарункамі», прывабліваючы і гродзенцаў, і турыстаў, якія наведваюць Свята-Барыса-Глебскі храм. Дарэчы, ужо зараз многія наведвальнікі парку з задавальненнем фатаграфуюцца каля гэтых скульптур.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА

■ Ведай нашых!

ЧАТЫРЫ МЕДАЛІ Ў СКАРБОНКУ

Два сярэбраныя і два бронзавыя медалі заваявалі беларускія школьнікі на 27-й Міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы ў Казахстане.

Беларусь у Алматы прадстаўлялі адзінаццацікласнік Ліцэя г. Наваполацка Мікіта Сазановіч, вучаніца 11-га класа гімназіі №1 г. Віцебска Барбара Кускова, дзесяцікласнік гімназіі № 8 г. Віцебска Ілья Мядзянікаў і выпускнік Іўеўскай сярэдняй школы Аляксей Вісцяж. Трэніравалі каманду загадчыца кафедры інфарматыкі Мінскага дзяржаўнага вышэйшага радыётэхнічнага каледжа Ірына Кіріловіч і старшы выкладчык кафедры вылічальнай матэматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксей Тоўсцікаў.

Канкурэнцыя была надзвычай востраю: за прызавыя месцы змагаліся 322 канкурсанты з 84 краін свету. Але ўсе нашы школьнікі вярнуліся дамоў з узнагародамі: сярэбраны медаль у Мікіты Сазановіча і Барбары Кусковай, а «бронза» — у Аляксея Вісцяжа і Ілы Мядзянікава.

Дарэчы, Аляксей Вісцяж стаў прызёрам міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы ўжо ў другі раз. Праўда, летась у Тайвані ён заваяваў «серабро». Сур'ёзна займацца інфарматыкай і праграмаваннем таленавіты вучань пачаў яшчэ ў сёмым класе. А ўжо ў восьмым класе ўдзельнічаў у рэспубліканскай алімпіядзе па гэтым прадмеце, заваяваўшы на абласным этапе дыплом III ступені.

Як пераможца міжнароднай алімпіяды, Аляксей мог без здачы іспытаў стаць студэнтам вядучых расійскіх ВНУ. Аднак малады чалавек абраў месцам свайго далейшага навучання Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, куды быў залічаны без праходжання цэнтралізаванага тэсціравання.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Крытыка на шпільцы

МАЯ БЕЛАРУСКАЯ КНІГА. З ЧАГО ПАЧАЦЬ?

Не так даўно выдавецтва «Попурри» прадставіла серыю «Мая беларуская кніга». Яе склалі 25 тамоў, напісаных класікамі беларускай літаратуры, і зборнік казак і паданняў. На прэзентацыі прагучала пытанне: «А з чаго пачаць? Што найлепшае?»

Пытанне, на мой погляд, вельмі цікавае, бо добра адлюстроўвае сённяшнюю сітуацыю — у нашай краіне не так многа людзей, якія добра ведаюць нацыянальную класіку. З аднаго боку, кожны беларус чуў імёны Купалы, Коласа, Багдановіча. З другога — мала хто можа адказаць на пытанне: «А якія з іх твораў вам падабаюцца?» Узнікае ўражанне, што сваё беларускае не чытаецца, бо нечытэльнае — няякаснае, нецікавае, незразумелае. І пісьменнікі нашы не творцы, а выключна песняры «касы ды сахі».

Між тым, мы, як правіла, вельмі мала ведаем пра сваю літаратуру і сваіх літаратараў. Нават пра тых, чые творы здавалася б, вывучалі ў школе. Ці многія ведаюць, што пісьменнік Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, аўтар «Пінскай шляхты», неаднойчы быў пад судом і нават сядзеў у турме на Валадарцы ў 1835 годзе? Гэты драматург быў вельмі папулярнай асобай Мінска сярэдзіны XIX стагоддзя. Аднак не толькі яго тэатральная дзейнасць — а ён быў яшчэ і выдатным акцёрам! — прынесла яму вядомасць, але і авантурны характар. Так, ён неаднойчы абвінавачваўся ў падробцы дакументаў аб дваранскім паходжанні, для вытворчасці якіх быццам бы выкарыстоўваў паперу, штучна састараную з дапамогай тытуню і кавы, а таксама свой талент каліграфа. Не менш цікавая і гісторыя пра тое, як нейкі багаты вораг з помсты заказаў у мінскіх цэрквах пахавальны звон па жывым пісьменніку. Нават жаніўся Дунін-Марцінкевіч з прыгодамі! Нядаўна архівіст Зміцер Дрозд знайшоў дакументы, якія сведчаць пра тое, што сваю зусім юную нявесту пісьменнік выкраў, насуперак волі яе бацькоў, таемна павянчаўся з ёю, а пасля таго, як яе змясцілі ў манастыр па заяве бацькоў, выйграў справу аб выкраданні і ажаніўся з ёю наноў. Прыгоды, вартыя мастацкага фільма!

Не менш цікавым чалавекам быў і Янка Маўр, якога называлі беларускім Жулем Вернам. Мала хто сёння ведае, што, акрамя добра вядомых старэйшаму пакаленню «Палескіх рабінзонаў» і «ТВТ», гэты аўтар напісаў шмат прыгодніцкіх і навукова-фантастычных твораў, якія, між іншым, актыўна перакладаліся за мяжой. Адны іх назвы чаго вартыя! «Вандраванне па Зорку», «Аповесць будучых дзён», аповесць «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага»... Не толькі ў творчасці, але і ў жыцці гэты пісьменнік быў вялікім арыгіналам. Вядома, што для таго, каб лепш уяўляць сабе далёкія заморскія краіны, пісьменнік паставіў пісьмовы стол на мастках над Свіслаччу і пісаў, звесіўшы ногі ў ваду. А для напісання кнігі «Амок» Янка Маўр збіраў інфармацыю, выкарыстоўваючы сваё веданне штучнай мовы эсперанта. Але самым неверагодным з таго, што давялося пра яго прачытаць, выглядае наступны факт: дзіцячы пісьменнік і адначасова школьны настаўнік захапляўся спірытызмам пры дапамозе сподачка і стала з алфавітам! Як пішуць, у яго было нават два сшыткі, куды ён запісваў вынікі спірытычных сеансаў, але ў 1938 годзе ён іх спаліў. Эх, многае аддала б за тое, каб у іх зазірнуць! Наогул, жыццё Янкі Маўра (Івана Фёдарава) настолькі цікавае і змястоўнае, дзіўна, што ніхто яшчэ не напісаў яго біяграфію ў серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі», бо відавочна, гэты пісьменнік быў з кагорты тых, якія апярэджваюць свой час.

Поўнай супрацьлегласцю адказнаму родапачынальніку фантастычнага жанру быў лірычны Міхась Стральцоў. Паэт, празаік, літаратуразнаўца... Ён нарадзіўся ў вёсцы, аднак для тых, хто яго ведаў, быў увасабленнем арыстакратызму і багемнасці. Багемны лад жыцця ўрэшце яго і згубіў, хоць у памяці сваіх равеснікаў ён застаўся прыгажуном, эталонам элегантнасці, любімцам жанчын. Цікава, што пісаў гэты аўтар пра тыповага беларуса, «сена на асфальце», які быў ужо не вяскоўцам, але і не да канца гараджанінам. Аднак сама яго творчая манера была вельмі сучаснай, па-еўрапейску рэфлексіўнай. Дастаткова адкрыць яго сапраўды геніяльнае апавяданне «Смаленне вепрука», каб зразумець, што перад намі пісьменнік, чые творы доўга не страцяць актуальнасці — столькі ў іх высакароднай тонкасці, мастакоўскай назіральнасці, пранізлівай глыбіні. Зноў жа менавіта ён па-сапраўднаму адкрыў беларускаму чытачу другога выбітнога лірыка — Максіма Багдановіча, пра якога Стральцоў напісаў неверагоднае эсэ «Загадка Багдановіча», дзе разважае не толькі пра творчасць свайго папярэдніка, пра яго лёс, узаемаадносіны з бацькам, але і пра прыроду самога літаратурнага мастацтва.

Такім жа гарадскім фацэтам, выкшталцоным кавалерам, на якога не магчыма было не звярнуць увагу, быў і Уладзімір Караткевіч. Гісторык, пісьменнік, паэт, але да ўсяго і аматар сяброўскіх пасядзелак, выдатны апавядальнік, любіцель вясёлых розыгрышаў, ад якіх часта цярпелі пазбаўленыя гумару паплечнікі. Мала хто ведае, што аўтар культавых твораў «Чорны замак Альшанскі» і «Дзікае паляванне караля Стаха» да ўсяго быў і выдатным малявальшчыкам, чый талент праяўляўся нават у такім складаным жанры, як комікс. Пра жарты Караткевіча многа пісалі яго сябры. А вось якім быў Караткевіч у стасунках з жанчынамі, выдатна напісаў Дзяніс Марціновіч у сваёй кнізе «Жанчыны ў жыцці Уладзіміра Караткевіча», з якой можна даведацца, каму быў прысвечаны першы зборнік паэта «Матчына душа», ці існаваў працяг рамана «Каласы пад сярпом тваім», хто і чаму называў чачэнскую паэтэсу Раісу Ахматаву жонкай пісьменніка і што звязвала Караткевіча з арганізатарам знакамітай выставы авангарднага мастацтва ў Манежы ў 1962 годзе.

Як бачым, што ні лёс, то прыгода! І гэта толькі пісьменнікі, чые імёны на слыху!

Аёсць жа яшчэ і тыя, пра якіх не кожны беларус чуў. Напрыклад, Саламея Пільштынова, аўтарка кнігі «Авантуры майго жыцця», якая не толькі стала знакамітай лекаркай без медыцынскай адукацыі, але і практыкавала пры дварах турэцкага султана, расійскага імператара і беларускіх магнатаў Радзівілаў і Сангушкаў. У Вене яна лячыла членаў турэцкага пасольства, у Стамбуле — жанчын гарэма. Сярод самых вядомых яе пацыентаў быў трансільванскі князь Ёжэф Ракоцкі, галоўны прэтэндэнт на венгерскі прастол. Пасля смерці мужа гэтая доктарка і пісьменніца траціла грошы на вандроўкі і выкуп палонных. Дзе скончылася яе поўнае дзівосных прыгод жыццё, невядома. У 1760 годзе Пільштынова адправілася са Стамбула ў Святую Зямлю, і далейшы лёс яе для нас — таямніца. Аднак засталіся яе неверагодныя «Авантуры», якія не толькі адкрываюць малавядомае шырокаму колу чытачоў пісьменніцкае імя, але і мала даследаваную старонку нацыянальнай гісторыі.

Дык з чаго ж пачаць чытанне? Якая ж кніга найлепшая, які аўтар самы цікавы? Адказ, здаецца, відавочны. Пачынайце з таго, пра што раней не ведалі. Не бойцеся не праверaных школьным падручнікам імёнаў. Беларуская літаратура — багатая на сюрпрызы, асабліва тады, калі адносіцца да яе без насцярогі і з цікавасцю.

Ганна КІСЛІЦЫНА

Открытое акционерное общество
«Дорожно-строительный трест № 3»
сообщает о проведении
ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ,
которое состоится 18 августа 2015 года в 11.00
по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О проведении закрытой подписки на акции ОАО «ДСТ № 3».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 18.08.2015 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 10.08.2015 г.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию с 11 августа 2015 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 33.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-24 – ОЭАиП.

УНП 700049607 **Наблюдательный совет.**

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

объекта долевого строительства «Многоэтажный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по ул. Филимонова».

Национальный олимпийский комитет Республики Беларусь информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.

Информация о застройщике.

Застройщик – Национальный олимпийский комитет Республики Беларусь, зарегистрирован решением Министерства юстиции Республики Беларусь от 14.04.2006 г. №185 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100265118. Адрес местонахождения: 220020, г. Минск, ул. Радужная, д.27/2.

По вопросам заключения договоров долевого строительства обращаться в **торгово-строительное унитарное предприятие «Олимпийские проекты»,** УНП 190191720. Предприятие выполняет функции заказчика по договору-поручения.

Адрес заказчика: 220012, г. Минск, пр. Независимости, 80а, ком. 10-14.

Режим работы: понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обед с 13.00 до 13.45.

Телефоны для справок: 280-80-98, 287-34-84.

В течение предыдущих трех лет предприятие осуществляло функции заказчика при строительстве объекта «Штаб-квартира Национального олимпийского комитета Республики Беларусь».

Информация о проекте строительства.

«Многоэтажный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по ул. Филимонова» расположен в г. Минске.

Начало строительства – 20.11.2012 г., окончание строительства 01.09.2015 г.

